Ніва

БЕЛАРУСКІ ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНЫ ТЫДНЁВІК

№ 28 (1272) ГОД XXV БЕЛАСТОК 13 ЛІПЕНЯ 1980 г. ЦАНА 2 ЗЛ.

ФЭСТ У СЕМЯНОЎЦЫ

22 чэрвеня першая палавіна дня была сонечная, такая менавіта, як гэта было 39 год таму назад, калі неспадзявана наляцелі і пачалі бамбіць мірныя гарады і чыгуначныя станцыі нашай ваколіцы нямецкія самалёты. Успаміналі мы аб гэтых страшных чэрвеньскіх падзеях 1941 года, едучы аўтобусам ГП БГКТ на народны фэст у Семяноўцы, што ў Нараўкаўскай гміне. Уязджаем адразу на вялікі школьны пляц, на якім ужо шмат людзей. А сабралася іх на фэст каля 2 тысяч. Прывяло іх сюды жаданне пачуць беларускае слова і песню. Аўтобусам БГКТ прыехала таксама частка самадзейнікаў.

А 12 гадзіне распачалася ўрачыстасць. На трыбуну, зробленую з дзвюх самаходных прычэпаў, упрыгожаных высокімі бярозкамі, за якімі на вялікім чырвоным палотнішчы віднеў напіс: „35 год перамогі над фашызмам", увайшоў ганаровы прэзідыум. Фэст адкрыў начальнік мясцовай гміны Язэп Навіцкі. У сваім выступленні ўспомніў ён страшныя дні нямецкай акупацыі, той час, калі многія прыпушчанскія вёскі былі спалены, а людзі вывезены. Пасля гаварыў ён аб вялікіх пераменах, якія адбыліся ў гэтых вёсках пры народнай уладзе. Матэрыяльны ўзровень сённяшніх сялян праяўляецца, між іншым, і ў тым, што ў Нараўкаўскай гміне ёсць ужо больш як дзве сотні ўласных самаходаў.

Затым член Прэзідыума Галоўнага праўлення БГКТ Вінцук Склубоўскі выступіў з дакладам, прысвечаным 35 гадавіне перамогі над гітлераўскай Германіяй. Змястоўны і цікавы даклад з вялікай увагай быў выслуханы прысутнымі, бо ён расказваў аб нечуваным змаганні народаў, а ў першую чаргу савецкіх народаў з гітлераўскай навалай, аб аграмадных знішчэннях і гібелі мірнага насельніцтва.

Пасля даклада распачалася мастацкая частка. У ёй выступілі жаночыя хоры з Навасад, Курашава і Міклашэва. Усе пункты іх праграмы ўзнагароджваліся багатымі воплескамі.

А затым — нечаканасць. На трыбуну-пляцоўку ўвайшоў вакальны калектыў „Конопа" з Чэхаславакіі, з горада Радышковіцы, які прыехаў у Польшчу ў рамках супрацоўніцтва і абмену з хорам Бельскага сельскагаспадарчага тэхнікума „Падляшскія зязюлі" і, дзякуючы намаганням Гайнаўскага дома культуры і яго дырэктара Мікалая Бушко, наведаў беларускі фэст і даў канцэрт. Выступленне „Конопы" (як песні, так і танцы) адрознівалася сваёй арыгінальнасцю і значна ўзбагаціла мастацкую частку фэста.

Апошнімі выступілі навучэнцы беларускага ліцэя ў Гайнаўцы. Іх высокі мастацкі ўзровень быў моцным акцэнтам урачыстасці, свайго роду святам беларускай культуры ў Семяноўцы.

Вёў канцэрт Янка Крупа. Ён таксама правёў пажарніцкі конкурс, пераможцы якога атрымалі цікавыя ўзнагароды.

На фэсце таксама адзначана 20-годдзе культурнай дзейнасці дырэктара гміннага асяродка культуры ў Нараўцы — Ольгі Закройшчык. Дырэктар Дома культуры ў Гайнаўцы інж. Мікалай Бушко ўручыў ёй ганаровы ліст-падзяку і грашовую ўзнагароду.

Фэст набліжаўся к канцу. Закрываліся ГС-аўскія ларкі з прадуктамі і напіткамі, развітваліся арганізатары народнага беларускага фэста, якімі з'яўляліся ГП БГКТ, Гайнаўскі дом культуры, гмінныя ўлады [illegible] вёскі С[illegible]. [illegible] [illegible] Навасад [illegible] [illegible] з Ку[illegible] [illegible], а з яго прыадкрытых вокан звінелі мелодыі беларускіх песень. Захмурылася неба, і пайшоў дождж.

Тэкст і фота **Міхася Хмялеўскага**

Харавы калектыў з Навасад.

Вакальны калектыў з Радышковіц (Чэхаславакія).

Самадзейнікі з Курашава.

Жанчыны з Міклашэва.

КАВАЛЕР ОРДЭНА АДРАДЖЭННЯ ПОЛЬШЧЫ

ТАКОЕ МАЁ ЖЫЦЦЁ

Расказаць вам пра сваё жыццё? А навошта каму гэта патрэбнае? Кажаце, каб маладыя навучыліся, як жыць, як [illegible]? Так, гэта праўда, што прайшлі мае [illegible] з [illegible] гадоў з думкай больш пра іншых, чым пра свае асабістыя справы. І не таму, што мы з жонкай асталіся адзінокія, бяздзетныя, самі для сябе жывем, а перш за ўсё таму, што такая мая доля, такая праца і такі ў мяне характар. Іншыя людзі будаваліся, багацце разводзілі, дзяцей вучылі, жанілі, замуж выдавалі, аўтамабілі, дываны і мэблю куплялі... А я што? Як той заяц — з вёскі ў вёску, з пастарунка на пастарунак. Найперш за бандамі, якім не падабалася народная ўлада, а пасля за рознымі зладзеямі і злачынцамі, якім не па сэрцу сумленная праца. Так прайшло маё жыццё...

Кажаце, каб маладыя ад мяне павучыліся. Глупства кажаце, бо я не хацеў бы пажадаць ім такога шчасця, якое выпала на маю долю. Не, не падумайце, што я чаго-колеч шкадую. Можа толькі тых чатырох бясплодных, а як жа невыносліва цяжкіх год, якія прасядзеў я ў нямецкай няволі... Можа толькі гэтага... А так жыццё сваё правёў я добрасумленна. Гавару, як на споведзі.

Ага, заслугі? Не буду крывіць душой — яны цешаць мяне. Пры вялікіх святах прышпіляю я да пінжака свае крыжы і медалі. Не, не таму, каб людзям свяціць імі ў вочы, але таму, што гэта наяўная ацэнка сэнсу майго жыцця, яго правідловага напрамку. Вядома, найбольш я ганаруся **Кавалерскім Крыжам Ордэна Адраджэння Польшчы.**

Мы з жонкай прывыклі да скромнага жыцця. Яна ў мяне ніколі не працавала, хаця і бяздзетная, бо я слабы на здароўі і патрабую пастаяннага добрага догляду, каб з'есці ўпару, чайку гарачага, сваёй каўбаскі, свежай вяндлінкі... ну, ведаеце, калі страўнік падводзіць... Неяк маёй пенсіяй абыходзімся. А кватэра ў нас дзяржаўная, проста драўляная хата, яшчэ даваенная, пасляяўрэйская... І так жывем удваіх. Наўрад ці хто з маладых хацеў бы задаволіцца такім жыццём. Ім зараз не хапае часу, каб задумацца над яго сэнсам, усё некуды спяшаюцца, каб як найхутчэй разбагацець, разжыцца. Ну так, я згодзен, што не ўсе так настаўлены да жыцця, але і такіх магу я вам пальцам паказаць... Сэрца мне баліць, калі пра гэта думаю. Хіба мы на сваёй выбаістай дарозе ў новы грамадскі лад чагосьці не дагледзелі, штосьці прапусцілі. А можа гэта толькі мне так здаецца? Можа, каб меў я ўласных дзяцей, дык таксама змагаўся б за іх дабрабыт? Бо да чаго мы імкнемся? Каб нам лепш і выгадней жылося! Гэта наша мэта. За ажыццяўленне яе мы і змагаліся.

Ну, праўда, я разгаварыўся, як тая баба, мужык якой, уцякаючы ад яе балтаўні, дзвярыма язык прыбіў, а яна яшчэ праз нос мармытала. Добра, годзе. Пачну па парадку. А калі па парадку, дык трэба вярнуцца ў вёску Сасіны. Гэта ў Мілейчыцкай гміне. Быў год 1918. Неспакойны, яшчэ ваенны. Вядома, я асабіста гэтага не памятаю, але ведаю з расказаў сваіх бацькоў і старэйшых аднавяскоўцаў. Колькі тады рознага войска пралятала праз нашу зямлю! Сваё і чужое, за рэвалюцыю і супраць яе. У рэшце рэшт у бацькі нават і куркі не асталося. Толькі дзесяць моргаў зямлі і пустыя, разваленыя будынкі. Я быў найстарэйшы. Пазней пабагацелі мы на трох братоў і адну сястру. Стала зацесна ў хаце, замнога рук да супольнай міскі, і мне давялося ісці ў пастухі...

Што тут доўга гаварыць! Тыповы лёс майго пакалення, у якога юнацкія гады прыпалі на міжваенны перыяд. Памятаю, колькі ціхіх размоў і трывожных шэптаў выклікаў арышт Нікалаюка і Леўчука. *„За партыю, за КПЗБ іх пасадзілі,"* — перадавалі нашы дзядзькі адзін другому. Тады я ўпершыню даведаўся аб існаванні камуністычнай партыі, [illegible] за правы бедных.

Не, няма ўжо ў жывых ані Нікалаюка, ані Леўчука, [illegible] я лічу іх сваімі настаўнікамі, хаця асабіста я ўступіў у партыю, у Польскую рабочую партыю,

(Працяг на стар. 4)

БЕЛАРУСКІЯ КНІГІ

У кнігарні імпартных выданняў [illegible] можна набыць [illegible] на беларускай мове:

Купала Я., Яна і я, 19[illegible], цана 20 зл.

У гэтым выданні з'ядналіся ў адзінае тры дасканаласці. Паэма „Яна і я" — чароўны гімн каханню, створаны нашым песнярам у часы найбуйнейшага росквіту яго таленту. Аздобіў яе цыклам цікавых ілюстрацый вядучы беларускі графік Г. Паплаўскі — яго афорты самыя па сабе з'яўляюцца самастойнай мастацкай каштоўнасцю. Адрэдагаваў жа гэтае арыгінальнейшае па форме выданне на чарпальнай паперы выдатны беларускі паэт-лірык Рыгор Барадулін. Сапраўдная жамчужына сярод беларускіх выданняў.

Карамазаў В., Пушча, 1979, стар. 384, цана 38 зл.

Раман пра беларускія лясы.

Чарнышэвіч А., Выбраныя творы, 1979.

Том I, стар. 512, цана 42 зл., склалі яго раман „Світанне" пра станаўленне Савецкай улады на Беларусі і апавяданні ранейшага перыяду творчасці пісьменніка;

том II, стар. 464, цана 38 зл., змяшчае аповесць „На сажалках" для дзяцей і апавяданні пазнейшага часу.

Гуліцкі М. Ф., Нарысы гісторыі беларускай лексікаграфіі, 1978, стар. 120, цана 19 зл.

Манаграфія пра слоўнікі беларускай мовы XIX і пачатку XX стагоддзяў і іх аўтараў.

Лось Е., Выбраныя творы ў двух тамах, 1979, I/II стар. 640, цана 64 зл.

Клубныя вечары, 1979, цана 10 зл.

Зборнік песень беларускіх кампазітараў на словы паэта Уладзіміра Карызны. Карыснае выданне для самадзейнасці.

Кнігарня высылае кнігі за паштовым залічэннем. Запатрабаванні накіроўвайце па адрасу: „Dom Książki", 15-089 Białystok, ul. Kilińskiego 10.

(мг)

З БЕЛАРУСКАГА ДРУКУ

ШЫЮЦЬ... ТОКІ

Токі высокай частаты (ТВЧ) становяцца інструментам швейнікаў. На Мінскай скургалантэрэйнай фабрыцы брыгада наватараў стварыла спецыяльную аснастку для зваркі вырабаў з дапамогай ТВЧ. Новая тэхналогія ўдвая павысіла прадукцыйнасць працы. Значна зніжаны расход матэрыялаў.

КАЛЯНДАР

570 гадоў назад
15.7.1410 адбылася Грунвальдская бітва.

80 гадоў назад
15.7.1900 нар. У. Дубоўка, беларускі савецкі паэт.

60 гадоў назад
14.7.1920 нар. А. Астапенка, беларускі савецкі паэт.

35 гадоў назад
17.7. — 2.8.1945 Канферэнцыя „вялікай тройкі" ў Патсдаме. Прыняты асновы ўзгодненай палітыкі ў адносінах пасляваеннай Еўропы.

Niwa

BIAŁORUSKI TYGODNIK SPOŁECZNO-KULTURALNY

ODZNACZONY ZŁOTĄ ODZNAKĄ „ZASŁUŻONY BIAŁOSTOCCZYŹNIE"
Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego

ADRES REDAKCJI
Niwa
ul. Wesołowskiego 1
15-950 Białystok, skr. poczt. 149
tel. 2-32-41

Wydawca: RSW „Prasa-Książka-Ruch", Kombinat Wydawniczo-Kolportażowy w Białymstoku. Prenumeratę na kraj przyjmują Oddziały RSW „Prasa-Książka-Ruch" oraz urzędy pocztowe i doręczyciele. Cena prenumeraty rocznej 104 zł. Prenumeratę ze zleceniem wysyłki za granicę, która jest o 50% droższa od prenumeraty krajowej, przyjmuje RSW „Prasa-Książka-Ruch", [illegible]

B.Z.Graf. Zam. 1095. Nakład 7.700 I-2

IX З'ЕЗД БГКТ

З. Рыбіцкі. Фота З. Лянкевіча.

ВЫСОКА ЦЭНІМ ВАШУ ДЗЕЙНАСЦЬ...

— Беларускае грамадска-культурнае таварыства прыйшло на з'езд з багатымі дасягненнямі ў сваёй дзейнасці. Гэта культурна-асветная праца, што паспяхова пашыраецца, а таксама актыўны ўдзел членаў таварыства ў грамадска-палітычных і гаспадарчых мерапрыемствах, якія ініцыюе і развівае наша партыя, — сцвердзіў у пачатку свайго выступлення кіраўнік адміністрацыйнага аддзела Ваяводскага камітэта ПАРП **Збігнеў Рыбіцкі** і працягваў: — Дазвольце таму, таварышы дэлегаты, што ад імя і па даручэнню кіраўніцтва Ваяводскага камітэта Польскай аб'яднанай рабочай партыі, ад імя Першага сакратара ВК тав. Уладзіслава Юшкевіча, прысутнага на з'ездзе сакратара ВК тав. Юзэфа Пяхоўскага, Беластоцкага ваяводы, прысутных тут віцэ-ваяводы Зенона Світая і старшыні Ваяводскага камітэта Фронту Адзінства Народу тав. Станіслава Кудлы, а таксама сваім уласным горача і сардэчна падзякую вам, а праз ваша пасрэдніцтва ўсім актывістам і членам вашага таварыства за творчае развіццё культурна-асветнай працы, а таксама за актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці і ўклад у памнажэнні грамадска-гаспадарчых здабыткаў нашай чароўнай Зямлі Беластоцкай.

Асаблівыя словы прызнання і ўдзячнасці кірую Галоўнаму праўленню БГКТ і яго Прэзідыуму, якое пад кіраўніцтвам тав. Мікалая Самоціка — самаахвярнага партыйнага дзеяча — плённа развівае дзейнасць вашага таварыства.

Дзякую калектыву рэдакцыі тыднёвіка „Ніва" з яго галоўным рэдактарам тав. Георгіем Валкавыцкім за актыўны ўдзел у папулярызацыі праграмы нашай партыі, грамадска-гаспадарчых дасягненняў Беласточчыны і пераўтварэнняў у грамадскім жыцці рэгіёна, паказ людзей добрай работы, якія маюць аўтарытэт і пашану ў асяроддзі, а так[illegible] [illegible] [illegible] скую дысцыпліну.

Затым З. Рыбіцкі пазнаёміў з'езд з асноўнымі фактамі развіцця Беласточчыны за апошняе дзесяцігоддзе. Падкрэсліў, што ў нашым ваяводстве маем цяпер навейшую прамысловасць і не толькі традыцыйную тэкстыльную, але і самую сучасную, якая цэніцца ў тэхніцы — электронную, дакладных прыбораў, металаапрацоўчую, навейшыя прадпрыемствы па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавой прамысловасці. Нашыя прадпрыемствы выпускаюць за год прадукцыю вартасцю ў 46 мільярдаў злотых, а вартасць агульнай вытворчасці беластоцкай сельскай гаспадаркі дасягае 20 мільярдаў злотых у год. Цяпер у ваяводстве ў народнай гаспадарцы працуе больш за 190 тысяч чалавек, у тым ліку ў прамысловасці і будаўніцтве — 80 тысяч. Кожны трынаццаты чалавек, што працуе ў грамадскай гаспадарцы, мае вышэйшую, а кожны чацвёрты — сярэднюю або паўвышэйшую адукацыю. Больш чым палова жыхароў у гарадах жыве ў дамах з новага будаўніцтва. Толькі за мінулыя чатыры гады здадзены ў карыстанне 15,5 тысячы кватэраў, у якіх справілі наваселле каля 50 тысяч чалавек. У той самы час укладзена ў грамадскую гаспадарку больш за 30 мільярдаў злотых, гэта значыць на 42,7% болей, чым у гадах 1971-75.

Значна павысіўся матэрыяльны і культурны ўзровень жыцця людзей, на 1000 жыхароў прыходзіцца больш за 180 тэлевізараў і 200 радыёпрыёмнікаў, у бібліятэках — 2730 кніг, а на аднаго жыхара ваяводства па 83 экземпляры газет і часопісаў. У прыватным уладанні ёсць 30 тысяч легкавых машын. Сяляне, што гаспадараць індывідуальна, маюць 11 тысяч трактараў і многія тысячы іншых сельскагаспадарчых машын. Гэтыя лікі былі б яшчэ большыя, калі б была магчымасць поўнасцю задаволіць попыт. Горад Беласток стаў вялікім навуковым, асветным і культурным цэнтрам, вядомым не толькі ў нашай краіне, але і па-за яе межамі. У пяці беластоцкіх вышэйшых школах займаецца каля 11 тысяч студэнтаў. Дагэтуль сярод абсальвентаў дыпломы лекараў атрымала больш за 5 тысяч чалавек, а Беластоцкую палітэхніку і філіял Варшаўскага універсітэта закончыла 8 тысяч чалавек.

У ахове здароўя працуе 1968 лекараў медыцыны і зубных лекараў, у тым ліку 26 прафесараў, 411 дацэнтаў і дактароў медыцыны. Па колькасці медыцынскіх кадраў Беласточчына займае выдатнае месца ў краіне.

Вядучую ролю ў пашырэнні культуры адыгрываюць беластоцкія творчыя асяроддзі, драматычны і лялечны тэатры, філармонія, кінатэатры, бібліятэкі, шматлікія асяродкі культуры. Нягледзячы на павелічэнне колькасці тэхнічных сродкаў перадачы, не слабее развіццё аматарскага мастацкага руху і ў гэтым вялікая заслуга таксама БГКТ, — падкрэсліў З. Рыбіцкі.

— Ажыццяўляем мы прынцып — чым большы ўклад дамо ў агульнанацыянальны даход, тым больш атрымаем на далейшае развіццё нашага рэгіёна, — сказаў З. Рыбіцкі. — Трэба, каб усе разумелі неабходнасць працаваць лепш, салідней, ахвярней, з запалам. Неабходна павялічваць эфектыўнасць гаспадарання ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, на кожным прадпрыемстве, на кожным месцы працы, у кожнай сялянскай гаспадарцы. Гэта адзіная дарога да ажыццяўлення заданняў, вызна-

(Працяг на стар. 4)

У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

Фэст у Плюцічах ◆ Слова пра мужнасць ◆ З запісак ваеннага перакладчыка ◆ Гальяш Леўчык ◆ Галгофа ◆ Быць начальнікам ◆ Гародчык цёткі Мальвіны ◆ Весткі з Гайнаўкі, Ляшукоў, [illegible] ◆ [illegible] ча бульбы ◆ Кухонныя парады ◆ Алімпійскі гумар ◆ Песня „Черемшина"

TELEWIZJA WARSZAWA

Niedziela 13 VII — 7.0[illegible] TTR [illegible] Zajęcie wakac. [illegible] 7.2[illegible] wakac. [illegible] V. 7.40 No[illegible] w [illegible] ogrodzie. 8.10. Emerytury dla rolników. 8.20. Telewizjada. 8.55 Program dnia. 9.00 Kino teleran. „Czarna góra" — radz. film fab. 10.25 Antena. 10.50 Kazachstan — film dok. 11.50 Sport i piosenka — pr. rozr. 12.15 Dziennik. 12.30 Rolnicze rozmowy. 13.00 Tylko w niedzielę.

Poniedziałek 14 VII — 9.00 Teleferie. 15.20 Pr. dnia. 15.25 Nurt. Naucz. pocz. 15.55 Obiektyw. 16.15 Dziennik. 16.30 Wakacje w kręgu rodziny. 17.25 Ocalić od zapomnienia. 17.45 Gołąbeczka — odc. II film fab. ZSRR. 18.50 Dobranoc. 19.00 Echo stadionów. 19.30 Dziennik. 20.10 Teatr TV. R. Rolland „Wilki". 21.40 Rozśpiewane obrazy — pr. rozr. 22.05 Hiszpania od dyktatury do autonomii. 22.35 Dziennik.

Wtorek 15 VII — 9.00 Kino teleferii. 15.20 Pr. dnia. 15.25 Klub seniora. 15.55 Obiektyw. 16.15 Dziennik. 16.30 Wakacje w kręgu rodziny. 16.55 Interstudio. 17.20 Sonda. 17.55 Królik Bugs przedst. 18.20 Studio młodych. 18.50 Dobranoc. 19.00 Studio olimp. 19.30 Dziennik. 20.10 Kaprysy Marii — komedia fr.-wł. 21.45 Ex libris. 22.10 Międzynarodowy mityng lekkoatl. im. J. Michałowicza. 22.50 Dziennik.

Środa 16 VII — 9.00 Teleferie. 15.50 Pr. dnia. 15.55 Obiektyw. 16.15 Dziennik. 16.30 Wakacje w kręgu rodziny. 16.55 Losowanie express i małego lotka. 17.05 Dom i my. 17.20 Skarbiec. 17.45 Televariette. — pr. estradowy TV CSRS. 18.50 Dobranoc. 19.00 Studio olimpijskie. 19.30 Dziennik. 20.10 Psychoza — film krym. USA. 22.05 Konkrety. 22.35 Camerata. 23.00 Dziennik.

Czwartek 17 VII — 9.00 Teleferie. 15.50 Pr. dnia. 15.55 Obiektyw. 16.15 Dziennik. 16.30 Wakacje w kręgu rodziny. 17.35 Reportaż wojskowy. 18.00 Turystyka i wypoczynek. 18.20 Studio młodych. 18.50 Dobranoc. 19.00 Lekarz radzi. 19.10 Studio olimpijskie. 19.30 Dziennik. 20.10 Pozory mylą — film krym. ang. 21.00 Pegaz. 21.50 Konfrontacje. 22.10 Dziennik. 22.25 Trybuna literacka.

Piątek 18 VII — 9.00 Teleferie najmł. 15.50 Pr. dnia. 15.55 Obiektyw. 16.15 Dziennik. 16.30 Wakacje w kręgu rodziny. 16.55 Melodie. 17.30 Doleko od szosy. odc. II — film fab. 18.50 Dobranoc. 19.00 Magazyn bezpieczeństwa ruchu drogowego. 19.30 Dziennik. 20.10 Kompozytor 35-lecia — Lucjan Kaszycki. 21.00 Studio olim[illegible] 21.25 Wieczór profesorów. 21.40 Piękne głosy. Antonina Kowtunow. 22.25 Poglądy. 22.40 Dziennik.

Sobota 19 VII — 15.25 Pr. dnia. 15.30 Czy pamiętasz żołnierzu — wojsk. pr. hist. 15.55 Obiektyw. 16.15 Dziennik. 16.30 Studio młodych. 17.00 Igrzyska olimpijskie. 18.50 Dobranoc. 19.00 Świat, który nie może zaginąć. 19.30 Dziennik. 20.10 Pogoda dla bogaczy — film fab. USA. 21.05 Blisko i daleko — pr. publ. 21.35 Tańczy Elżbieta Jaroń. 22.00 Studio olimpijskie. 22.30 Dziennik. 22.45 Dziewczyna zwana Hatter Fox — ang. film fab.

ТЭЛЕВІЗІЯ МІНСК

Piątek 11 VII — 8.05 Film ser. 8.55 Filmy anim. 9.25 Koncert. 18.45 Film fab.

Sobota 12 VII — 15.20 W świecie zwierząt. 16.55 Filmy anim. 18.30 P. nożna. ZSRR—Dania. 20.35 Koncert. 21.40 Motocyklowe mistrz. świata.

Niedziela 13 VII — 15.15 Klub podróży. 17.00 Panorama międzynar. 17.45 Film anim. 18.45 Teatr miniatur.

ГАВОРЫЦЬ БЕЛАСТОК!

Беларуская радыёперадача: субота 12.05 — 12.25 (UKF).

КІНО

Białowieża Czas przeszły — fr. 15—16. Młody Frankenstein — USA 17—18. Lekcja martwego języka — pol. 19—20.

Bielsk Podl. Prawdziwe życie Drakuli — rumun. 14—15. Znaków szczególnych brak — pol. 16—17. Miłość bywa zbrodnią — wł. 18—19. Kung Fu — pol. 20.

Czyże Ostatni z Fleksnerów — norw. Colargol i cudowna walizka — pol. 16—20.

Gródek Ukochana żona — wł. 19—20.

Hajnówka Ostatni z Fleksnerów — norw. 14—15. Brat kata — NRD 16—17. Lawina — USA 18—20.

Michałowo Gang Olsena wpada w szał — duńs. 15—16. Dubler — fr. 17—18. Placówka — pol. 19—20.

Mielnik Nokaut — jug. 19—20.

Milejczyce Na cichej stacyjce — węg. Pierwsza miłość — wł. 16—20.

Narew Klincz — pol. Ofiara namiętności — hiszp. 16—20.

Narewka Wielki samotnik — rum. Sekret Enigmy — pol. 16—20.

Nurzec Jutro się policzymy kochanie — czes. 15—16. Ojciec królowej — pol. 17—18. Prywatne piekło — USA 19—20.

Orla Basen — bułg. Szał — ang. 16—20.

Rajsk [illegible] — jug. Przygody Picass[illegible] — szwedz. 1[illegible]—20.

Інтэрнэт-версія © BFiK Kamunikat.org 2024

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА — АЛЯКСАНДАР БАРШЧЭЎСКІ

[illegible]

ЯНКА КУПАЛА — ЧАСТКА VI

Сутыкненне маладога Купалы з польскім памешчыкам Зыгмунтам Чаховічам адкрывала Купалу дзверы ў свет кнігі, так як кантакт з казачнікамі адкрыў дзверы ў свет вуснай творчасці. Розніца аднак не толькі ў гэтым. Казачнікі былі беларусамі, Чаховіч быў палякам. Казачнікі ўводзілі Купалу ў свет беларускай казкі, а Чаховіч — у свет польскай кнігі.

Цікава, што малады Купала ў адносінах да народных казачнікаў і Чаховіча прымяніў той самы метад. У сувязі з тым, што жонка Чаховіча была „настоящая ведьма“ і марыла яго голадам, Купала падкрадаў у маці правіянт, найчасцей сыр і падкармліваў памешчыка.

Такім чынам „плаціў“ за кнігі. Аб сваіх кантактах з Чаховічам Купала ў „Аўтабіяграфічных матэрыялах“ гаворыць даволі шырока. Вось найцікавейшыя фрагменты яго выказванняў:

„Когда мы жили в [illegible] Сигизмундом Чаховичем. Помещик этот был в свое время сосланный Муравьёвым в Сибирь, но впоследствии вернулся и жил безвыездно в своем имении в Беседах. У него была громадная библиотека, в большинстве из польских книг. Вот тут-то мне и открылся что называется клад!“

Купала падкрэслівае, што як бы паралельна з чытаннем кніг адбываліся размовы з Чаховічам, які ахвотна апавядаў аб паўстанні 1863 года. Чаховіч быў у нейкай меры жывой ілюстрацыяй тых інфармацый, якія Купала знаходзіў у кнігах і публікацыях:

„Беседовал с ним много, о чем? — трудно вспомнить, но больше всего, кажется, о польском восстании 63 года. Часто он мне выбирал книги для чтения, а иногда я сам просил его таких или других авторов. Кроме всякого рода поэзии, которой я больше всего увлекался, беллетристики, истории и т.п., у него первого я познакомился с нелегальной литературой, больше всего относящейся к польскому восстанию...

...Помню хорошо, что читаемая тогда [illegible]“

Такім чынам, даходзім да другой крыніцы, якая адыграла вялікую ролю ў крышталізацыі поглядаў юнака Купалы і станаўленні яго літаратурнага таленту. Гэтай крыніцай з'яўлялася кніга. У сваіх аўтабіяграфічных запісах Купала выразна акрэслівае тып і характар літаратуры, якая выклікала найбольшае захапленне.

„Какой автор тогда произвел на меня большее впечатление — трудно сказать. Но в общем помню хорошо, что книга, где говорилось о тяжкой доле бедного люда, всегда меня захватывала“. Пасля такога сцвярджэння, Купала называе такіх пісьменнікаў, як Кандратовіч, Канапніцкая, Ажэшка, Някрасаў, Кальцоў. Несумненна, гэтыя пісьменнікі былі найбліжэйшыя сэрцу маладога Купалы, і ў яго ранняй творчасці знойдзем найбольшую прысутнасць духу іх спадчыны.

КРАСУЙ НАША ДРУЖБА!

ПРОСІМ ЧАСЦЕЙ!

19 і 20 чэрвеня гасцявалі на Беласточчыне выдатныя беларускія пісьменнікі **Аляксей Гардзіцкі** з Мінска і **Аляксей Пысін** з Магілёва.

Аляксея Пысіна мы ведаем як майстра разнастайных лірычных форм з багатым светам вобразаў і эмоцый. Ён за выдатныя творчыя дасягненні ўзнагароджаны дзяржаўнай прэміяй Беларускай ССР імя Я. Купалы. Але вялікай неспадзяванкай для нас было тое, што паэт свой прыезд на Беласточчыну назваў вяртаннем у маладосць. Неўзабаве высветлілася, што гэта ж тут, у Бельску, у рэдакцыі раённай газеты, ён, абсальвент Камуністычнага інстытута журналістыкі ў Мінску, пачынаў у 1939 годзе свой працоўны і творчы шлях журналіста і паэта.

А. Гардзіцкі расказаў пра пашырэнне беларускай літаратуры сярод іншых народаў.

Дагэтуль Аляксей Гардзіцкі быў нам вядомы як аўтар кніг, у якіх ён з вялікай пранікнёнасцю ў тайнікі творчага працэсу і ў пластычных пераканаўчых вобразах набліжае грамадству тых творцаў, што стварылі і ствараюць найбольшыя каштоўнасці ў беларускай літаратуры і культуры. Значнае месца пісьменнік адводзіць беларуска-польскім літаратурным [illegible] Беласточчыне, — гэта знакамітая нагода для папаўнення сваіх назіранняў.

Нашыя госці жыва цікавіліся жыццём нас, беларусаў Беласточчыны, а перш за ўсё культурнай і літаратурнай дзейнасцю. Яны наведалі рэдакцыю „Нівы“, пазнаёміліся з яе працаўнікамі. У часе размовы за шклянкай гарбаты іх асабліва цікавіла ўзнікненне пры БГКТ і „Ніве“ літаратурнага асяроддзя, яго дзейнасць. З прызнаннем выказваліся аб працы БГКТ і „Нівы“ ў папулярызацыі ведаў пра БССР, яе культуру, літаратуру, гісторыю. Затым некалькі гадзін госці знаёміліся з горадам Беластокам, яго помнікамі.



А. Пысін зачараваў сваімі вершамі...

Увесь вечар таго дня савецкія пісьменнікі прысвяцілі сустрэчы ў Галоўным праўленні БГКТ. У асабліва сардэчнай атмасферы прайшло і аўтарскае спатканне з актывістамі нашай арганізацыі, пенсіянерамі, самадзейнікамі. З выступлення А. Гардзіцкага мы пачарпнулі многа новага пра пашырэнне твораў беларускіх пісьменнікаў сярод іншых народаў. А. Пысін зачараваў дэкламацыяй сваіх вершаў з розных год — і тых, што паўсталі яшчэ ў школьныя гады, і тых, якія нарадзіліся ў апошнія дні. Уражвала глыбіня думак і пачуццяў гэтай самабытнай лірыкі. Яна перапляталася ў нейкае лагічнае цэлае з успамінамі паэта пра яго змаганне на розных франтах Вялікай Айчыннай вайны, працу ў мірны час, бо з гэтага і бярэцца яе радавод.

Наступны дзень — гэта падарожжа ў Бельск і Белавежу. У Бельскім беларускім ліцэі госці сустрэліся з ліцэістамі і настаўнікамі, наведалі спецыяльны кабінет-музей, прысвечаны Грамадзе і яе заснавальніку і кіраўніку Б. Тарашкевічу, імя якога прысвоена гэтай школе. Блуканне па вулічках Бельска, у якім засталіся два гады жыцця і працы тады ўсяго дзевятнаццацігадовага паэта і журналіста Алёшы Пысіна, цяпер [illegible] маладосць для Аляксея Пысіна...

І хіба толькі пошум сівой Белавежы змог суцішыць боль у душы паэта. Пісьменнікі там наведалі прыродазнаўчы музей, дыхнулі спрадвечным спакоем велічнай пушчы, а праз некалькі гадзін сустрэліся ў Бельскім доме культуры з групай маладых любіцеляў літаратуры. І тут зноў пайшла гаворка пра розныя таямніцы творчага варштату, дэкламаванне вершаў. Займальная і павучальная.

Начны экспрэс забраў нашых гасцей з беластоцкага вакзала. Але мы ўпэўнены, што яны яшчэ да нас завітаюць.

Мікалай Гайдук
Фота аўтара і **М. Шаховіча**



У Пілніцкім лесе.

З НАРОДНАЙ АБРАДНАСЦІ

ЗАПРАДАННЕ ДУШЫ

На самазабойцу ў народзе ёсць толькі адно акрэсленне — прадаў душу нячыстай сіле. Пакуль аднак да гэтага, неабходна спыніцца на самым запрадаванні душы. Згодна з народным вераваннем, запрадаць душу можна было і пры жыцці, доказам чаго з'яўляюцца шматлікія казкі, дзе гаворыцца, як бацька за прынесеную яму ў дарозе дапамогу (найчасцей выратаванне жыцця) аддае чорту „тое, чаго дома не пакінуў“. А гэтым з'яўляецца дзіця, якое нарадзілася ў час яго адсутнасці і аб якім ён не ведаў. Але спатыкаецца і такое, калі чалавек для ўласнай выгады, для шчаслівага зямнога жыцця ўходзіць у кантакт з нячыстай сілай. Прыкладна, расказ пра паляўнічага, запісаны ў ваколіцах Саколкі, а вядомы амаль ва ўсёй Беласточчыне. Адзін чалавек меў вялікую сям'ю, якую ўтрымоўваў з паляўніцтва. Ад пэўнага часу апусціла яго паляўнічае шчасце. Перастала трапляцца звярына. Аднойчы, вяртаючыся з чарговага беспаспяховага палявання, спаткаў нейкага незнаёмага. Той выслухаў яго гора і падказаў яму выхад, але толькі за распіску крывёй з мізіннага пальца. Паляўнічы выканаў умову і згодна з падказаным стрэліў у сярэдзіну перакрыжоўкі прыдарожнага крыжа. З гэтага часу ўсё адвярнулася. Пачаў прыносіць дамоў самую лепшую звярыну. Моцна разбагацеў. Але людзі гаварылі, што доўга ён мучыўся, калі паміраў, а душа яго па сёння блукае начамі па лясах і ганяецца за звяр'ём.

Так як успаміналася, душа самазабойцаў была зданая на вечныя пакуты. Гэтакую напластоўку ўнесла з сабой хрысціянская рэлігія. Кожнае самагубства, згодна з народным перакананнем, было свайго роду вяселлем, вялікай радасцю для нячыстых сіл. Водгукам гэтага на Зямлі з'яўляецца моцны вецер, які нечакана сарваўся ў пагодні дзень і доўга, доўга вее. І сёння яшчэ старэйшыя людзі гавораць: ну і вятрыска, мусіць нехта павесіўся. Апрача таго, што душу самазабойцаў за пасрэдніцтвам хрысціянскай рэлігіі памяшчалі ў пекле, народнае ўяўленне выбягала яшчэ і ў фантазію. Пекла было створана рэлігіяй і прыйшло пазней. Некалі іх душы прымалі розныя постаці. Рэшткі гэтага прабытавалі ў народзе нават да сёння. Не хто іншы, як пакончыўшыя самагубствам, далі пачатак рознага тыпу русалкам, вадзяным дзедам.

Русалка найчасцей спалучаецца з жанчынай. Людзі ўяўляюць яе, як прыгожую, з доўгімі валасамі, маладую дзяўчыну, якая жыве ў жыце. „Русалкай страшылі некалі дзяцей, — гавораць у Макаўцы, — але пераважна хапала яна маладых хлопцаў. Чаму? А гэта не што іншае, як свайго роду помста. Русалка, паводле народнага перакання, гэта душа маладой дзяўчыны, якая праз свайго каханага хлопца пакончыла самагубствам.

Калі душа маладой дзяўчыны дала пачатак русалцы, дык душа тапельца змянілася ў вадзянога дзеда. Гэтакае перакананне бытуе на Беласточчыне. У адваротнасці да русалкі вадзяны дзед быў увасабленнем брыдоты — стары, з вялікімі зялёнымі валасамі і барадой ды даўжэзнымі пазурамі. Выплываў заўсёды пасля заходу сонца, і таму ёсць перасцярога, што нельга купацца, калі сонца села за гарызонт.

Зразумела, гэта ўжо рэшткі колішняга веравання людзей, рэшткі, пачатак якіх быў яшчэ ў часах язычаства. Наступіла асіміляцыя з хрысціянскай рэлігіяй, паводле якой ёсць толькі дзве магчымасці — рай або пекла. Душы самазабойцаў, інакш, згодна з сённяшнім перакананнем, запраданыя нячыстай сіле, некалі прымалі розныя постаці. Маглі зменьвацца і ў рабака, які жыў у дрэве. Хаця рэдка, але ўсё ж такі можна яшчэ пачуць, як гавораць, асабліва калі кінуць у печ нейкае палена і яно так працяжна на агні запішчыць, што гэта плача душа, якая змянілася ў ра[illegible] сёння называюць [illegible].

Міхась Шаховіч

(Працяг са стар. 1)

ТАКОЕ МАЁ ЖЫЦЦЁ

[illegible] 9 ма[illegible] тады ўжо за сабой пабыўку на фронце і ў палоне, і жонку варшавянку, якую я прывёз з Аўстрыі...

Ці чагосьці я тут не наблытаў? — пытаеце. — Не, гэта ўсё праўда. 13 красавіка 1941 года ўзялі мяне ў Чырвоную Армію. Проста тады прызывалі маіх равеснікаў. Толькі гэтая дата: 13 красавіка, зашкодзіла, аднак, яна мне. Служыў я ў другой кулямётнай роце, 615 стралковага палка. Кулямёт „Максім", гэтакі двухкалёсны, мелі мы тады на ўзбраенні. Я быў другі нумар, значыць, падаваў ленту з патронамі. Давялося нанюхацца пораху і наглядзецца на смерць ды раны сваіх таварышаў. Пад Рагачовам фрыцы нас прыдубчылі. Можа нейкіх дзесяць разоў падрываліся мы ў атаку. На маіх вачах загінуў наш камандзір Грэкаў... І, на жаль, не ўдалося нам прабіцца з акружэння. Найперш загналі нас на поўнач, дзе Паўночнае мора, а адтуль перакінулі ў Аўстрыю, у Крэнцлагер, здаецца, так называлася гэтае праклятае намі месца. Яшчэ зараз у вачах маіх стаіць той пышлівы дубовы гай, у які зімой пасля кожнай ночы выносілі па 50-60 памерпіых ад холаду і голаду ваеннапалонных. Там я неяк і дачакаўся вызвалення. А 9 мая 1945 года, якраз у Дзень Перамогі, я ажаніўся. Яна — варшавянка. За ўдзел у паўстанні яе вывезлі таксама ў Аўстрыю, у лагер. І тут мы пазнаёміліся і пакахалі адзін другога. Як найвярнейшы сябар, спадарожнічала яна мне ўсюды і ва ўсім.



Ага, зноў я адбягаю ўбок, а вы хацелі б, каб па парадку. Значыць, трэба ўспомніць пра Валодзьку Бартнічука. Гэта чыгуначнік родам з невялікай вёскі Баравікі, таксама ў Мілейчыцкай гміне. Чыгуначнік — камуніст. Ён быў тут галоўным арганізатарам партыйных ячэек. І мяне сагітаваў. А калі стаў я ўжо членам партыі, дык і запрасілі мяне ў міліцыю. Самі ведаеце, што быў гэта вельмі неспакойны час і людзей, адданых жыццём і думкамі народнай уладзе, краіна наша тады патрабавала. Памятаю, у лютым 49 накіравалі мяне на пастарунак у вёску Шумова пад Замбровам. Камендант у Бельску, развітваючыся са мною, па-сяброўску папярэдзіў: *„Памятайце, каб нават у нужніку не выпускалі вы зброі з рук. Там ужо чатырох нашых забілі..."* Паўтара года прабыў я ў гэтым Шумове. І, як бачыце, у жывых неяк астаўся, хаця па-рознаму даводзілася. А пазней былі яшчэ іншыя пастарункі і астаткова прызямліўся я ў Мілейчыцах. Ад 1968 года — ужо на пенсіі... Такое маё жыццё... Можа не зусім тыповае, але ці варта аб ім пісаць?

Так ён, **Аляксандр Сідарук, Кавалер Крыжа Адраджэння,** закончыў свой расказ. Ці варта? Гэта [illegible] самі чытачы. [illegible] Сідарук.

[illegible]

Фота аўтара

Удзельнікі фэста ў Семяноўцы.

(Працяг са стар. 2)

Высока цэнім вашу дзейнасць...

чаных рашэннямі партыі, якія галоўнай мэтай ставяць дабро ўсяго грамадства.

У заданнях і праблемах, пра якія я казаў, знаходзіць сваё месца ваша таварыства, яно з'яўляецца адным са звенняў Фронту Адзінства Народу. Многія з вашых членаў — гэта актывісты і дзеячы нашай Партыі, палітычных арганізацый, нарадовых радаў, прафсаюзных, жаночых і маладзёжных арганізацый. Высока цэнім вашу дзейнасць у галіне культуры, у захаванні традыцый беларускага фальклору. Трэба развіваць разнастайную народную творчасць. Добрай традыцыяй сталі прыгожыя ўрачыстасці і мерапрыемствы: народныя фэстыны, конкурсы беларускай песні, агляды тэатральных калектываў, урачыстае адзначэнне гадавін і дзяржаўных святаў, вечарыны. Маеце сур'ёзныя дасягненні ў выдавецкай справе, аўтарскіх сустрэчах. Багатымі дасягненнямі ў публіцыстыцы дакументуецца ваш тыднёвік „Ніва".

Беларускае грамадска-культурнае таварыства разам з іншымі арганізацыямі ўносіць сур'ёзны ўклад у справу ўмацавання ідэй польска-савецкай дружбы, пашыраючы веды пра СССР і асабліва пра нашага суседа — Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку. Высакародную ідэю дружбы польскага і савецкага народаў трэба развіваць і ўзбагачаць.

З. Рыбіцкі выказаў упэўненасць, што члены таварыства будуць актыўнымі ўдзельнікамі ажыццяўлення рашэнняў VIII з'езда Партыі і зычыў усім членам таварыства задавальнення ад штодзённай працы і грамадскай дзейнасці.

Без задняй думкі

ДЗЕ ВЫ ПАЭТЫ?

Мы настолькі знудзіліся па новых паэтах, што часам хапаемся нават не за самое спадзяванне, а за нашае спадзяванне спадзявацца. Усе, хто любіць паэзію, ужо даўно спрагнены і даволі зачакаліся.

Вялікі паэт — гэта складаемае ўласнага характару і ўласнага слоўніка. Вялікі паэт — асабістае рабочае кляймо на ўсім, што ім зроблена. Вялікія паэты блізнюкамі быць не могуць. Але ці ж можам мы зараз пазнаць асабістае кляймо хоць бы аднаго паэта, не дасягнуўшага трыццаці год, калі нам падсунуць вершы непадпісанымі, ці ж мы маем шчаслівую магчымасць зараз жа ўскліКнуць: „Гэта, вядома, ён..."? Адкрываючы падборкі маладых, мы коўзаем па іх ні ўзрадаванымі, ні нават раздражненымі вачыма — цяжка зачапіцца за нешта хоць бы непрыемным, але ўсё-ткі здзіўленнем.

Чаму ў нас няма датрыццацігадовых, але ўжо шырока вядомых, самастойных паэтаў, аб якіх можна сур'ёзна паспрачацца, а не проста паляпаць іх па плячы? Чаму яны, чорт яго ведае, не з'яўляюцца? Хай з'яўляюцца хоць голыя, абы толькі не ў чужой вопратцы: а то, глядзіш, адзін у клюеўскіх оперных чаравіках, другая — з ілжэахматаўскай вуалеткай, трэці — у парыжскім шаліку Вазнясенскага на скусанай перадзелкінскімі*) камарамі шыі. Паэты і ва ўласную скуру апранацца не павінны, а не то што ў чужыя анучы.

(З артыкула Яўгенія Еўтушэнкі ў „Литературной газете" за 11 VI 80).

*) Перадзелкіна — падмаскоўная дачная мясціна, дзе знаходзіцца гарадок і творчы дом пісьменнікаў. Усё ў лесе — рэд.

ГМІННЫЯ НАВІНЫ

ПРА[illegible]ВЫЯ СОЛТЫСЫ

У Хара[illegible]кай гміне 29 солтысаў. [illegible] з іх з'яўляюцца: Генрык Раецкі са Златорыі, Станіслаў Вандалоўскі з Бабіна, Антон Загурскі з Рушчанаў, Антон Попка з Рагова і Юры Семянюк з Баршчэва. Яны адначасова і добрыя гаспадары, і грамадскія дзеячы, завадатары многіх добрых пачынанняў. Многія з іх з'яўляюцца раднымі гмінных і ваяводскай радаў нарадовых, дзеячамі ПАРП і ЗСЛ.

Солтыс Генрык Раецкі — добры паляявод, з хлебаробскім вопытам. Старанлівы, працавіты. Вядзе ён сямігектаровую гаспадарку. Пра яго можна сказаць, што зямля раскрыла яму насцеж свае кладоўкі. У мінулым годзе ён прадаў дзяржаве сельскагаспадарчых пладоў на суму 120 тысяч злотых.

Станіслаў Вандалоўскі, солтыс вёскі Бабіна, вядзе семнаццацігектаровую гаспадарку і спецыялізуецца ў гадоўлі свіней на базе ўласных кармоў. У яго абора з кармакухняй. Гаспадарка ў яго высокатаварная. Ён самы лепшы гаспадар, спрактыкаваны земляроб. Дзяржаве прадае ён сельскагаспадарчых пладоў на суму 420 тысяч злотых у год.

Малады солтыс і гаспадар Антон Загурскі з Рушчанаў мае 23-гектаровую гаспадарку з нахілам у бок жывёлагадоўлі. Ён спецыялізуецца ў гадоўлі малочных кароў (гадуе ў сярэднім 12-14 дойных кароў). Гаспадар, якога можна паставіць за ўзор. А такіх у гміне няшмат. Дабіваецца ён высокіх ураджаяў цукровых буракоў — 500 цэнтнераў з 1 гектара. Бульбы бярэ не менш 220-250 цэнтнераў з 1 гектара. Збірае ў сярэднім па 30-40 ц/га збожжавых культур. Ён — прызнаны майстар высокіх ураджаяў.

А. Загурскі выконвае шматлікія грамадскія функцыі. З'яўляецца ён радным мейска-гміннай рады нарадовай, грамадскім апекуном, старшынёю надзорчай рады маслазавода ў Беластоку. Па яго ініцыятыве і дзякуючы яго намаганням у Рушчанах аднавяскоўцы самі будуюць краму. А. Загурскі — член ПАРП.

Антон Попка з Рагова — чулы, спагадлівы чалавек. Ён апрача солтысаўскіх абавязкаў выконвае абавязкі раднага ў гміне і займаецца ў камісіі па справах публічнага парадку. Як гаспадар спецыялізуецца ў гадоўлі малочных кароў.

Юры Семянюк з Баршчэва як хлебароб прыкладае ўсе сілы дзеля таго, каб ніва была яшчэ багацейшай, каб поле штогод радавала ўмалотным коласам. Жыта збірае ў сярэднім 30-35 цэнтнераў з гектара. Спецыялізуецца ў вырошчванні пасадачнай бульбы (230-250 кг з 1 га). У мінулым годзе ён прадаў на прыёмных пунктах усіх сельскагаспадарчых пладоў агульнай вартасці 270 тысяч злотых.

Ю. Семянюк выконвае абавязкі раднага і з'яўляецца членам камісіі грамадскага кантролю. Ён актыўны член ЗСЛ.

ЯЦ

МАЙСТРЫ ДРАЎЛЯНЫХ ВЫРАБАЎ

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З БЕЛАРУСІ

У аддзелах гэтага прадпрыемства пырхаюць пад столлю, падспеўваючы машынам, птушкі — зляцеліся на вострыя лясныя пахі.

Дрэваапрацоўчае вытворчае аб'яднанне ў беларускім горадзе Бабруйску.

Прывозяць сюды з навакольных лясоў яліну, бярозу, вольху, дуб. А вывозяць — парэзаную драўніну, фанеру, мэблю, шахматы. Далёка вывозяць: на ўвесь Савецкі Саюз і за яго межы, нават за Атлантычны акіян, у Амерыку, ідуць вырабы беларускіх майстроў.

Калектыў гэтага прадпрыемства прымаў удзел у абсталёўванні, абліцоўцы, нарыхтоўцы мэблі ў такія славутыя, унікальныя аб'екты, як Крамлёўскі палац з'ездаў і гмах Савета ўзаемнай гаспадарчай дапамогі ў Маскве, акадэміі навук у Маскве і Ленінградзе, Маскоўскі дзяржаўны універсітэт, міжнародны турысцкі комплекс у горадзе Суздалі, Дом пісьменніка ў Мінску, [illegible] Беларусі.

Драўляныя вырабы з Бабруйска паказваліся на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР, праца іх стваральнікаў атрымала мноства дыпломаў і пахвальных лістаў, у тым ліку — ліст з Польскай Народнай Рэспублікі. Гэта ўзнагарода за ўклад у будаўніцтва Палаца навукі і культуры ў Варшаве.

З Польшчай аб'яднанне развівае рознабаковыя эканамічныя, культурныя і грамадскія сувязі. Тут дзейнічае аддзяленне Таварыства савецка-польскай дружбы, падтрымоўваюцца сяброўскія кантакты з падобнымі прадпрыемствамі. Нядаўна ў аб'яднанні абсталявана аўтаматычная лінія, зробленая ў Польшчы, навучыцца карыстацца ёю беларускім калегам памагалі польскія спецыялісты.

Тут безупынна ўдасканальваюцца машыны, таксама як безупынна ўдасканальваецца прадукцыя — асартымент мэблі, напрыклад, мяняецца кожныя два-тры гады. Вытворчасць цяпер амаль зусім не дае адпадаў — з іх выпрабляюць драўніна-валакністыя пліты [illegible] году ў год павышаецца адукацыя людзей, развіваецца творчасць, пачуццё адказнасці, узаемнай дапамогі, даверу.

І так, напрыклад, брыгада Мікалая Васілеўскага, што працуе на прасаванні драўніна-валакністых пліт. Усе ў ёй робяць, як у нас кажуць, „з сэрцам", з памыслам, шукаюць і знаходзяць новыя формы працы, якія ашчаджаюць энергію людзей і машын. А сам брыгадзір узнагароджаны медалем „За працоўныя заслугі", выбраны ў камітэт прафесіянальнага саюза.

Вышэйшай узнагароды Айчыны — ордэна Леніна — удастоена за сваю працу Станіслава Шымусік, Герой Сацыялістычнай Працы. І яшчэ сотні працаўнікоў аб'яднання ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР.

Хлапчуком прыйшоў сюды некалі Уладзімір Філіповіч. Працаваў электраманцёрам і вучыўся ў вячэрняй школе (ёсць на прадпрыемстве такая школа для рабочых), потым закончыў вышэйшую школу. Цяпер Уладзімір Філіповіч — намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання, старшыня аддзялення Таварыства савецка-польскай дружбы.

Аляксандру Кулічкову — 33 гады, чатыры апошнія з іх ён працуе дырэктарам адной з мэблевых фабрык, што ўваходзяць у аб'яднанне. Пра вырабы яго фабрыкі можна прачытаць такое выказванне, якое пакінула дэлегацыя венгерскай мэблевай фабрыкі з горада Зоолагерсеге: „Вельмі спадабалася нам [illegible] практычная, прыгожая". [illegible] напісана па-[illegible]. [illegible] добрых [illegible] можна [illegible] ад рабочых пра самога дырэктара. Нават людзі, шмат старэйшыя гадамі, прызнаюць яго аўтарытэт: „Ён мае ўсе ўласцівасці праўдзівага кіраўніка — глыбокае веданне работы, тактоўнасць, абаяльнасць".

ФАЛЬКЛОР

СЯМЕЙНАЯ

Ой, там к[illegible] зв[illegible]ыцца,
добрэ жэ м[illegible], як [illegible]ся,
добрэ жэ м[illegible], як брат [illegible].
Як брат ожыньвся, взяў вон братову,
став вон забыватьі про сыстру рыдную,
став вон забыватьі про сыстру рыдную.
— Чы я тобі, братэ, сорочкі ны прала,
што ты мiнi кажэш, што ны маю права,
што ты мiнi кажэш, што ны маю права.
Чы я тобі, братэ, сорочкі ны шыла,
што мiнi кажэш, коб я шла служыла,
што мiнi кажэш, коб я шла служыла.

Ад Ніны Такаюк, 1924 г. нараджэння, і Яўгінні Вішэнка, 1927 г. нараджэння, вёска Мікулічы гм. Мілейчыцы, запісаў у снежні 1979 г. М. Гайдук, мелодыю расшыфраваў Я. Бондар.

БУГ У АГНІ

ПАВЕРЫЦЬ У ЖЫЦЦЁ

Яго арганізм, знясілены голадам і ранамі, дабіваў яшчэ крывавы панос. Здавалася, што вырве пустыя кішкі і галодны страўнік, які і без гэтага амаль ужо прысох да хрыбта.

Іван Шыбакоў знаходзіўся ў лагеры-ізалятары, які быў адным з філіялаў сядлецкага цэнтра лагераў для савецкіх і іншых ваеннапалонных. Гітлераўцы закідалі туды хворых заразлівымі хваробамі, каб там ужо даходзілі яны паскоранымі тэмпамі.

Голад, боль і ніякай вестачкі з-за дро[ту]. Толькі часам штосьці шапнуў яму на вуха яго сябар, фельчар ветэрынарыі, якому Іван Шыбакоў, па-праўдзе, і ўдзячны за жыццё. Вось недзе пад канец жніўня 1941 года прынёс ён яму вестку аб пабегу з гэтага ж ізалятара 50 зняволеных, якія змаглі ўжо самастойна хадзіць. Іван зайздросціў ім, бо і сам марыў аб свабодзе і адначасова разумеў, што пры яго стане здароўя гэта зусім немагчыма, бо сам не здужае, а далучыцца да іншых таксама не можа, бо быў бы для іх гэтай калодай ля ног. Асталося тады толькі цешыцца ўдачай іншых таварышаў па няшчасці і думаць, што калі-небудзь і яму пашчасліўіцца. І гэтая думка дапамагала яму паверыць яшчэ ў жыццё, у яго святую вартасць, хаця ўсё навокал пярэчыла гэтай праўдзе, але ён хацеў і верыў, што трэба, што варта жыць...

Пасля пабегу гэтых 50 палонных, гітлераўцы наладзілі „чыстку“, у выніку якой Івана Шыбакова прызналі здаровым і вярнулі назад у агульны лагер н[а] пясках за вёскай Сухазебры.

„...а затым цераз тыдзень, — успамінае даўнейшы малодшы лейтэнант, — *нас 27 чалавек з лагера ў Сухазебрах павялі ў горад Бяла-Падляшска...“*

(Працяг на стар. 6)

...Мерна пастукваюць трачныя рамы, наслойваецца далікатнае фанернае палатно, складваюцца шафы, сталы, крэслы, растуць высокія гурбы ўпаковачных скрыняў з надпісам: „Made in USSR“. Штогод вартасць прадукцыі аб'яднання перавышае 75 мільёнаў рублёў. За год выходзіць 170 тысяч кубічных метраў парэзанай драўніны, 50 тысяч кубаметраў фанеры, 11 мільёнаў квадратных метраў драўнінна-валакністых прасаваных пліт, на 40 мільёнаў рублёў мэблі і многа іншай прадукцыі. Кожную мінуту распілоўваецца кубічны метр драўніны, выпрацоўваецца 26 з паловай квадратных метраў прасаваных пліт...

І сярод гэтага штодзённага працоўнага рытму, над плывучым побач струменем пахучай драўлянай прадукцыі — усмешка Моны Лізы. Партрэт Джаконды — гравюру ў дрэве выканалі рабочыя прадпрыемства і з замілаваннем прымацавалі да сцяны.

Такое адухоўленае дрэва мы сустрэнем у многіх аддзяленнях. І ў фабрычным прадшколлі: драўляны рыцар, драўляныя постаці з чароўных казак — творы рук і фантазіі выхавацеляў і дзяцей. Рэзь па дрэву — гэта адзін з напрамкаў навучання ў Бабруйскім мастацкім вучылішчы, якое рыхтуе спецыялістаў і для дрэваапрацоўчага аб'яднання — [illegible] Ба[illegible] ску[illegible]

[П]асля змены [рабо]чых праводзяць словы над выхадам: „Дзякуй за працу!“ Звычайныя, самыя па сабе зразумелыя ў нас словы.

Святлана Заяц

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

Пра беларускі фальклор

Украінскія фалькларысты шмат увагі прысвячаюць беларускаму фальклору, народнай творчасці і ўзаемасувязям у гэтай галіне. Журнал „Народна творчість та етнографія“, што выходзіць у Кіеве, надрукаваў на сваіх старонках за 1979 год тры артыкулы пра беларускі фальклор і народную творчасць. У 2 нумары вельмі цікавы артыкул „Давнэ народне будівництво українського та білоруського Полісся“. Артыкул гэты напісаў С. В. Вэргоўскі — загадчык аддзялення „Полісся“ музея народнай архітэктуры і побыту Украінскай ССР. Аўтар піша пра народную архітэктуру Жытоміршчыны і Брэстчыны, звяртае ўвагу на шматлікія супольныя рысы.

У 3 нумары прафесар М. С. Кацэр з Мінска, аўтар працы „Народное декоративно-прикладное искусство Белоруссии“ (1969 г.) змясціў артыкул „Народний орнамент художнього ткацтва та вышивки Білорусі“.

У 5 нумары Л. О. Малчанава з Мінска надрукавала артыкул „Дерев'яна архітектура білоруського Полісся“, у якім дала высокую ацэнку манаграфіі Ю. А. Якімовіча „Драўлянае зодчаства беларускага Палесся XVIII — XIX ст.“. Гэта кніга была выдадзена ў Мінску ў 1978 г. выдавецтвам „Навука і тэхніка“.

У 1 нумары вельмі цікавы артыкул „Білоруська народна дерев'яна культура“ змясціла кандыдат мастацтвазнаўства А. К. Леонава, супрацоўнік Інстытута мастацтва, этнаграфіі і фальклору А. Н. БССР.

Чытаючы гэтыя матэрыялы, насоўваецца думка і аб супольных карэннях народнай культуры Падляшша.

Іван Ігнацюк

Салісткі з Гайнаўскага белліцэя на фэсце ў Семяноўцы.

ЯКІЯ МЫ ЛЮДЗІ

ПА-МОЙМУ, ЛЕПШЫЯ

З перспектывы гадоў, якія раздзяляюць мяне ад таго часу, калі я выехаў з роднай зямлі, гляджу на беларусаў я цяпер. Гляджу інакш, чым аўтары, якія выступалі ў гэтай рубрыцы перада мной. Пётр Байко пісаў аб нядобразычлівых фурманах у Белавежы, яшчэ нехта аб п'яніцах у Гайнаўцы. Гэта брыдкія справы, з якімі трэба змагацца, каб яны не пакідалі пятна на нашым народзе. Таму ўдумлівыя і разумныя людзі павінны самі даваць добры прыклад і выхоўваць тых слабых духам, якія самі не могуць знайсці ўласцівай дарогі ў жыцці. Нялёгкая гэта рэч. Пацяшацца толькі можна тым, што ў кожнай грамадскасці ёсць людзі добрыя і дрэнныя. На Дольным Шлёнску таксама не бракуе абібокаў і п'яніц.

Я глыбока перакананы, што людзі непапраўна дрэнныя — гэта адзінкі сярод беларусаў. Калі яны адчуваюць несяброўскасць і справядлівую крытыку з боку рэшты грамадскасці, то напэўна вернуцца [illegible] моймі, [illegible] п'яніц або іншых падобных.

Якімі людзьмі з'яўляюцца сапраўды беларусы, паказала вайна, калі ў час акупацыі цэлы народ змагаўся з ворагам. Загінуў кожны чацверты беларус, але краіна стала вольнай. І адбудавалі яе людзі. Маладое наша пакаленне — здольнае і працавітае. Колькі ж на Беласточчыне і з Беласточчыны ёсць выпускнікоў вышэйшых школ! Ды і самыя малодшыя сягаюць па лаўровыя вянкі ў маштабе ўсёй краіны. Мне вялікі гонар ведаць, што першыя месцы — індывідуальныя і калектыўнае — у Алімпіядзе ведаў аб Польшчы і сучасным свеце занялі вучні Беларускага ліцэя ў Бельску — Андрэй Рубашэўскі і Міраслаў Дораш. Такія, як яны і іх настаўнікі, складаюць здаровую аснову народа. Гэта іменна яны даказваюць усім тым, хто сумняваецца, хто забывае родную мову, што беларусы людзі таленавітыя і кожнае пакаленне ўзнімаецца ўсё вышэй і вышэй па драбіне культуры, навукі і гаспадарчага жыцця.

Пытаючы далей, якія мы людзі, скажу: вясёлыя, культурныя, любім і ўмеем спяваць. Аб гэтым сведчыць колькасць удзельнікаў конкурсу „Беларуская песня“. Толькі людзі з чыстым сумленнем, якія ведаюць, што добра выконваюць свае абавязкі, могуць так бесклапотна і цудоўна спяваць. Я з далёкай [illegible] [illegible] нуўся беларус, адзін ці больш, няхай усюды гучыць наша беларуская песня!

Тамаш Кірылаў,
Легніца

В масі званіцы

ВЫЛЕЧЫЛІ

Лёг я ў бальніцу ў апошні сакавіцкі панядзелак, хоць накіраванне атрымаў у студзені. Усё „няма месца“ адказвалі на мой тэлефон. Дастаў я накіраванне на аснове болю ў жываце, а чакаючы свабоднага месца, паспеў захварэць на сэрца.

Лёг я, але ж не ляжыцца, калі трэба столькі ўсяго напісаць у „Ніву“. Не магу ж я з лёгкім сэрцам прамаўчаць выказванні Уладзіка Сідарука на тэму карэспандэнтаў, ці Натураліста на тэму забівання звяроў пры дапамозе чортавых прылад. Лап за аўтаручку і, лежачы на пузе, пачаў пісаць аб людзях-бандытах. Нічога напісаць не ўдалося, але ўдалося звярнуць на сябе ўвагу лекараў. Яны, убачыўшы, што не ляжу пад пледам і не стагну, вырашылі, што здаровы, што камбіную і перасталі звяртаць на мяне ўвагу. З іх паводзін лёгка было зразумець, што я ў бальніцы апынуўся выпадкова.

Усе мяне тут прымалі, як няпрошанага госця. Усім суп і другое блюда, а мне сухая бульба з рэдзькаю. Быў я без снедання, але і гэтага не з'еў — у знак пратэсту. На вячэру ўсім шынка, масла і белы хлеб, а мне ваду з постам, у якой варылі рыс. Ведаю, што рыс, бо пару крупінак плавала на талерцы: відаць, сітка прапускала, або талерка была ад рысу. Вячэра ў васемнаццаць, а праз дзве гадзіны мае калегі па зале дабываюць з шафак хто што мае і ўмінаюць, а мяне чума бярэ, што галодны і нічога не маю. Ляжу ды слухаю, як кішкі марш іграюць. Дачакаўся другога дня, і тое самае, бо дыэтэтычка забыла вызначыць мне дыэту. З ласкі атрымаў малочны суп. На трэці дзень заходжу на снеданне, ужо як паўнапраўны, заправіянтаваны. Гляджу, на сталах талеркі з малочным супам, талеркі з маслам і мартадэляй, ды збан з каваю і кубачкі. З'еў суп, аддаю ў акенца талерку, ды прашу каўбасы. Жанчына глядзіць на мяне як на вар'ята і кажа: „Супу магу даць, а каўбасы — не, бо порцыі палічаны“. Сканфужана гавару, што я па сваю, а не па дадатковую. Жанчына ўсміхнулася іранічна і падала мне скрылёчак каўбасы, ды паўпорцыі масла. Відаць, падумала, што зрабіла мне вялікую ласку. За ўвесь перыяд майго прабывання ў бальніцы глядзела на мяне як на хітруна-абжору. А я сарамліва спускаў вочы і баяўся выйсці на калідор, каб яе не сустрэць.

Калідор! Калі яго мыюць, то так як я мыў у арміі. Аднойчы быў дзяжурным па зале. Дзяжурны па роце крыкнуў: „На пастраенне!“ Я, як і ўсе, схапіў аўтамат і бягом на двор. Калі ўжо ўзводы сфармавалі шарэнгі, прыбег мой камандзір аддзялення і крыкнуў: „Петручук не вымыў падлогі ў зале, бягом марш!“ Я прыпёр наверх, схапіў квартачку вады і анучаю памачыў падлогу. Нават не ўсюды памачыў, бо квартачка гэта ж малая. Але ўбег „пісталет“ і пахваліў, што хутка памыў. Пабеглі мы абодва на пастраенне і нават ніхто не заўважыў нашай адсутнасці. Толькі пытанне: ці падлога была вымыта?

Пагаворка пераконвае нас, што які пан, такі крам. А тут наадварот, які крам, такі пан. Якая бальніца, такія і мы. Да ўмывальні і прыбіральні цяжка прабрацца. Хто першы паспее заняць месца, пакідае яе так, быццам другому робіць на злосць. Тут таксама прыкмеціў я цікавую з'яву. Менавіта заўважыў я, што кожны хворы, устаўшы з ложка, пачынае ранішні туалет ад мыцця. А ўжо калі вымые рукі і твар, тады ідзе да кабіны і апаражняе нос ды жывот і ўжо пасля гэтага рук не мые. Добра, што чалавек сябе не брыдзіцца. Не, мы думаем толькі пра сябе. Вядзем сябе дзіка і не хочам інакш.

А ўжо пра такую „дробязь“, як святло ці гарачая вада, то і гаварыць няма чаго. Зубы мыюць, вада льецца поўным струменем, брыюцца машынкай, вада гарачая струменем. Нават адзін такі ляжаў, што на галаве меў не больш дзесяці валасоў. І кожны дзень па некалькі разоў прабаваў іх прычасаць. Станавіўся ля ракавіны, пускаў ваду на „поўны ход“ і, мачыўшы ў ёй грэбень, лізаў валасы. А яны ніяк не хацелі ляжаць. Я аднойчы пацікавіўся і змерыў час. Аказалася, што ён чэша сваю „чупрыну“ не менш васьмі мінут. А гэта дае ванну гарачай вады. Ніколі нікому не [illegible] ў галаву, каб выключыць удзень святло. У прыбіральні ёсць

(Працяг на стар. 7)

інтэрнэт-версія © Kamunikat.org 2024

Сардэчныя тайны

Дарагое Сэрцайка, з Яркам хаджу я ўжо трэці год. Ніколі не было большых непаразуменняў і былі мы шчаслівыя. Але ўжо, мусіць, маё шчасце скончылася. Былі мы ў сяброўкі на імянінах. Спачатку было ўсё добра, весела, Ярэк, як заўсёды, быў сардэчны, але потым прыйшла дзяўчына. Яна была адна, без хлопца. Яе пасадзілі каля нас. І, калі ўсе ўжо былі падхмелены і яна таксама, пачала стукацца з Яркам чаркаю, ды ўжо і разгаварыліся абое. Бачу, Ярэк усміхаецца да яе. Я знервавалася і выйшла з хаты. Думала, што зараз жа і Ярэк за мной выйдзе. Але дзе там! Пастаяла я так адна і, хоць было даволі позна, ліў дождж і было холадна, я пайшла дамоў. Ішла адна па апусцеўшай вуліцы. Але з нерваў не адчувала ні холаду, ні страху. Толькі адна думка ўвесь час пульсавала ў галаве: як ён мог? Столькі ходзім, а ён у адзін міг змяніў мяне на другую. І каб хаця ўжо была нейкая прыгажуня? Ужо трэці дзень не бачу я Ярка. Мусіць, і не прыдзе ўжо ён да мяне. Я кахаю яго вельмі і, нягледзячы на ўсё, хацела б, каб вярнуўся ён да мяне. Але ці споўняцца мае мары? Як ты, Сэрцайка, думаеш?

Ірэна з Беластока

Ірэна! Як будзе, не магу я табе станоўча сказаць. Тое, што пару дзён Ярэк да цябе не прыйшоў, не значыць, што кінуў. Але і віны яго я тут не бачу. А ты паступіла дрэнна. У кампаніі ўсе адны да другіх гавораць, смяюцца, інакш жа немагчыма. І калі дзяўчына загаварыла да Ярка, а ён да яе, справа звычайная. Не мог жа ён адвярнуцца да яе задам. Нікуды ж ён з ёю не пайшоў і не аставіў цябе так, як ты яго. Відаць, ты празмерна зайздросная. А гэта нядобра. І калі ў далейшым будзеш так паступаць, можаш усё сапсаваць. Хай гэта будзе табе навучкай на будучыню. А цяпер будзь добрай думкі: калі кахае, не стане гэта яму перашкодай на дарозе да цябе.

Сэрцайка

Кансультацыя юрыста

ПЫТАННЕ: А., Б. і Ц. былі прыгавораны судом за крадзеж на шкоду дзяржавы. Галоўны абвінавачаны А. быў прыгавораны на 5 год турмы, а менш вінаватыя Б. і Ц. прыгавораны ўмоўна — кожны на два гады турмы. Суд абавязаў іх пры гэтым кампенсаваць шкоду, якая ацэнена амаль на 60 тысяч злотых. Б. па згодзе суда плаціць па 2000 зл. у месяц. Ц. не заплаціў нават залатоўкі і гаворыць, што плаціць не будзе, бо ён ніякай карысці з крадзяжы не меў і роля яго ў злачынстве была нязначная, а шкоду павінен кампенсаваць перш за ўсё А. Хто з абвінавачаных і ў якой ступені павінен адказваць за шкоду? Ці Б., калі заплаціць 20 тысяч зл., будзе звольнены ад абавязку далейшай сплаты? Што ён можа зрабіць, каб А. і Ц. таксама кампенсавалі шкоду?

АДКАЗ: Калі злачынства ўчынена некалькімі асобамі, іх адказнасць за шкоду салідарная. Абазначае гэта, што пакрыўджаны можа патрабаваць кампенсацыі ад усіх вінаватых, ад некаторых з іх, або нават ад аднаго з іх незалежна ад ступені іх віны. Калі суд адтэрміноўвае некаторым з абвінавачаных выкананне кары, як правіла, накладае на іх абавязак кампенсацыі цэлай шкоды. Калі Ц. будзе надалей ухіляцца ад сплаты, суд можа загадаць выканаць кару турмы і прымусова сыскаць ад яго належнае, але не можа спыніць сплаты ад Б. і пасля таго, калі ён заплаціць 20 тысяч, г.зн. трэцюю частку шкоды. Б. будзе прыслугоўваць права патрабаваць адпаведнай кампенсацыі ад А. і Ц. залежна ад іх віны і карысці, якую мелі ў выніку злачынства.

(Працяг са стар. 5)

ПАВЕРЫЦЬ У ЖЫЦЦЁ

„...[illegible]...“ [illegible] але для Івана Шыбакова гэты марш уеўся ў памяць самымі жудаснымі ўспамінамі. Канваіры адносіліся да гэтых ваеннапалонных горш чым да быдла. Загналі іх на станцыю, заперлі ў таварны вагон. У горадзе Лукаў загадалі зрабіць перасадку. У час гэтай мітусні хтосьці паспрабаваў шчасця ў пабегах. Спроба не ўдалася. Зноў пасыпаліся ўдары, а малейшая спроба абароны перад пабоямі лічылася як бунт і была дастатковай прычынай, каб прымяніць зброю...

„...У горадзе Люблін, — расказвае Іван Шыбакоў, — *нас пасадзілі ў турму...“*

Самай галоўнай гітлераўскай катоўняй у Любліне была турма ў Замку. Афіцыйна яна называлася так: **следчы астрог паліцыі бяспекі і службы бяспекі Люблінскай акругі.** Гэты астрог быў заснаваны зараз пасля акупацыі Польшчы, у пачатку лістапада 1939 года. У 56 камерах, з якіх 11 выдзялялася для жанчын, першапачаткова мела памяшчацца 700 вязняў. Здаралася, аднак, што ў замкавых засценках адначасова знаходзілася звыш 2500 у нічым не павінных людзей. Для прыкладу, 12 лютага 1944 года было там 2090 мужчын і 431 жанчына. Да 22 ліпеня 1944 года, значыць, да дня вызвалення Любліна, праз турму ў Люблінскім замку гітлераўцы прапусцілі 70-80 тысяч чалавек. Калі набліжалася вызваленне (дакладна — 20 ліпеня 1944 года), у гэтай катоўні знаходзілася яшчэ 2124 чалавекі-вязні, у тым ліку 329 жанчын. І тады гітлераўцы наладзілі масавае забойства зняволеных. Спачатку выводзілі іх па 15 чалавек на ўнутраны панадворак і тут іх расстрэльвалі, а затым — бо спяшаліся, бо чулі, што не паспеюць завяршыць сваю крывавую помсту — беглі ад камеры ў камеру і стралялі ў бездапаможных людзей. У абед, 22 ліпеня 1944 года Савецкая Армія і Людовае Войска Польскае былі ўжо так блізка, што гітлераўская адміністрацыя турмы ў Замку вымушана была спыніць крывавае жніво і ратаваць сваю скуру палахлівымі ўцёкамі. У жывых асталося яшчэ нейкіх 600 вязняў.

Іншай гітлераўскай катоўняй у Любліне, праслаўленай асабліва суровымі здзекваннямі, была турма гестапа на вуліцы Універсітэцкай, у будынку „пад гадзіннікам“. Амаль 20 тысяч чалавек акалечылі або цяжка пабілі там гітлераўскія каты. Пасля допытаў некаторыя вязні па некалькі тыдняў не маглі яшчэ ані стаяць, ані хадзіць, ані ляжаць на плячах.

Іван Шыбакоў не памятае, куды, у які астрог ён папаў: у Замак ці ў гестапа, а можа ў нейкі іншы лагер, якіх у Любліне было тады аж 15. Затое ўелася яму ў памяць што іншае... Паслухайце, калі ласка:

„...загадалі мне распрануцца да нагавіц і ўвапхнулі ў жалезную клетку, а затым давай сячы напорам халоднай вады з гідрантаў...“

Толькі што зажыўшыя раны зноў пацяклі кроўю, целам трасло ад холаду, а гэтыя вадзяныя шаблі сяклі і сяклі... аж ён [illegible] без памяці ў клетцы. Тады [illegible] Пранізлівы боль на хвіліну вярнуў свядомасць, і зараз жа зноў апынуўся ён у бездані. Абудзіўся ў нейкай камеры. Балелі аднаўленыя раны, хацелася піць, мучыла гарачка. Штосьці гаварыў, штосьці крычаў, кагосьці клікаў. Можа жонку, можа сына Юрку і дачушку Валю, што асталіся недзе над Бугам. Што з імі? Ці даведаюцца калі-колеч, як невынослівa цяжка церпіць іх бацька? За што? За якія злачынствы? Ці [illegible] тэорыяй фашызму, рашылі на практыцы паказаць сваю звышчалавечую сілу і важнасць, што боль і прыніжэнне іншага чалавека дастаўляла ім радасць і асалоду...

Іван Шыбакоў не памятае, як доўга давялося яму аставацца ў гэтых засценках, у якіх набавіўся ён цяжкай прастуды. У верасні таго ж яшчэ 1941 года перакінулі яго ў лагер для ваеннапалонных у горадзе **Замосць.**

„...Лагер у Замосці гэта самы жудасны лагер. Смяротнасць сярод палонных даходзіла да 500 чалавек у суткі. Найбольш людзей гінула ад тыфу...“

Так гэты перыяд свайго жыцця ўспамінае Іван Шыбакоў, а ў даведніку *„Гітлераўскія лагеры на польскай зямлі“* знайшоў я вось такую інфармацыю:

„Замосць — Каралёўка. Лагер для савецкіх ваеннапалонных — Шталяг 325 Замосць“. Існаваў ад ліпеня да снежня 1941 года. У лістападзе 1941 года налічваў 8303 палонных. Жылі яны пад голым небам. У лагеры лютаваў голад ды эпідэміі тыфу і іншых заразных хвароб. У лістападзе палонныя ўзнялі бунт. У час яго ўціхамірвання гітлераўцы наладжвалі масавыя забойствы. Астаўшыхся ў жывых палонных перасялілі ў лагер, які знаходзіўся ў самым горадзе Замосць, ля цяперашняй вуліцы Акшэі і памясцілі іх у бараках. Гэты лагер існаваў да восені 1942 года. Затым у гадах 1942-44 „Шталяг 325“ абсталявалі ля вуліцы Павятовай (зараз вуліца Людовага Войска Польскага). Агульная колькасць ахвяр, замучаных у замосцінскіх лагерах, ацэньваецца амаль на 28 тысяч чалавек.“

Зняволеныя жылі пад голым небам.

Столькі дакументы, захаваныя ў камісіях па даследаванню гітлераўскіх злачынстваў у Любліне і Варшаве. У памяці Івана Шыбакова горад Замосць, гэты цудоўны, прыгожы, старажытны польскі горад, на жаль, запісаўся вось так:

„...я хварэў, як мне здаецца, ад Кастрычніцкага свята да Раждзаства. Што тады тварылася са мною, як прайшоў гэты час — я нічога не памятаю. Не ведаю таксама, хто мною апекаваўся, хто ратаваў ад смерці. Як праз імглу, але з удзячнасцю ўспамінаю я Мікалая Кукліка — лейтэнанта з Валагды і яшчэ аднаго лейтэнанта з горада Калініна, прозвішча якога я не ведаю. Гэта яны, здаецца, вырвалі мяне з кіпцюроў касцухі. Да красавіка 1942 года ў лагеры асталося нас чалавек 1000-1500. Усе іншыя загінулі, а можа часткова былі некуды адпраўлены ў іншыя лагеры, як тыя дзевяць генералаў, якія дагэтуль знаходзіліся разам з намі. Памятаю, што навесну 1942 года ў гэтым лагеры пабудавалі ўрэшце баню і наладзілі дэзінфекцыю. Да гэтага часу на працягу дзевяці месяцаў мы зусім не мыліся. Цела абрасло цёмнай суцэльнай коркай бруду, перамешанага з вошамі. Вошы поўзалі не толькі па людзях, а нават і па нарах...“

Як жа глыбокая крыніца жыцця бурліла ў сэрцы гэтага чалавека, як моцна ён верыў у яго сэнс... Бо ці змог бы інакш перанесці ўсё гэта, ці змог бы [illegible] тым, аднак, ужо праз тыдзень.

Віктар Рудчык

Куток практычных ведаў

ЯК ЗВАРЫШ, [illegible]

Спозненая вясна прынесла нарэшце зяляніны ўдосталь. Нарэшце можам спажываць вітаміны, якіх не хапала нам зімою. Зяляніна паляпшае таксама апетыт, робіць стравы больш смачнымі і цікавейшымі. Уводзячы, аднак, у страву шчаўе, рэвень і шпінат, трэба памятаць, што ў іх знаходзіцца вялікая колькасць шчаўевай кіслаты, дзякуючы якой у арганізме чалавека знішчаецца кальцый. Таму стравы з гэтай гародніны неабходна запраўляць малаком або падаваць пры гэтым нейкую страву з малака ці сыра, што выраўняе страту кальцыю.

СУП СА ШЧАЎЯ З ЯЧНАЙ КАШАЙ

На 30 дэкаў робрышкаў узяць чатыры лыжкі ячнай крупы, жменю шчаўя, шклянку малака, паўшклянкі смятаны, соль, прыправу „Яжынка“, зялёную пятрушку.

Памытыя робрышкі паставіць варыць разам з ячнай кашай у невялікай колькасці вады. Калі мяса мяккае, а каша часткова расклеіцца, вымяшаць малако і смятану з маленькай лыжачкай мукі, дадаць у крупнік і адначасова ўлажыць пасечанае шчаўе. Дадаўшы ў суп шчаўе, трэба варыць яго даслоўна пару мінут. Падаючы суп на стол, выняць мяса, аддзяліць яго ад касцей, парэзаць і ўкінуць назад у суп.

ШЧАЎЕВЫ СОУС З КАЎБАСОЙ

Бярэм лыжку масла ці маргарыну, лыжку мукі, шклянку малака, паўшклянкі смятаны, жменю шчаўя, зялёную пятрушку, 25 дэкаў каўбасы і булённую костку.

Растапіць тлушч на патэльні і размяшаць з мукою, не падсмажваючы. Дадаць малако і смятану, памешваючы, закіпяціць. Дадаць у соус пасечанае шчаўе, нарэзаную тоненькімі кружкамі каўбасу, крыху разам усё паварыць, дадаць булённую костку і прыправы па смаку. Падаваць гэты соус з бульбай або кашай ці макаронам. Гэты соус вельмі добры таксама з бульбянымі катлетамі.

Сённяшнія нашы рэцэпты складаюцца са звычайных прадуктаў, з якімі клопатаў у магазінах ніколі не бывае. А звярніце ўвагу, якія яны іншыя! Здавалася б, тое ж самае, а падасі ў іншым выглядзе — і ядуць усе з зусім іншай ахвотай і апетытам.

Гаспадыня

АД ВЯЛІКАГА СМЕХУ ДА СЛЁЗ НЕДАЛЁКА

(Беларуская прыказка)

ВЕР-НЕ ВЕР

Дарагі Астроне, сніліся мне два цікавыя сны. Першы сон. Снілася мне, што я купіла белы свэтр, не з воўны, а з яшчэ лепшых нітак. Гэты свэтр быў не дамскі, а мужчынскі. Адным словам, быў вельмі прыгожы і акурат на мяне. Быў там і другі свэтр, але ён быў цёмнасіні, і я купіла белы. Яны абодва віселі ў вітрыне.

Другі сон. Быццам бы я ехала ў Беласток поездам. Я перасела з вагона ў прыбіральню, там было вельмі чыста і светла. Даязджаю я да станцыі і бачу вялікі надпіс: „Станцыя Кназазы“. Кназазы я ведаю, гэта малая вёска, там у мяне ёсць дзядзька, дык вось выходжу я на гэтай станцыі, а каля яе стаяць коні з санкамі.

Што могуць абазначаць гэтыя мае сны? Мне 20 год, я жыву ў малым гарадку.

Валя

Валя! Першы твой сон абазначае для цябе нешта добрае, бо выбрала ты белы свэтр. А бель і светлыя колеры прыносяць заўсёды нешта светлае і пагоднае. Што датычыць другога сну, дык ехаць поездам — не надта добра. Абазначае гэта для цябе нейкі смутак, тым больш, што перасела ты ў прыбіральню, якая дабра не прадвяшчае, хаця і было там чыста і светла. Усё ж найгорш, калі сніцца прыбіральня брудная, [illegible] твой хутка [illegible] Коні з санямі, якія чакалі цябе на станцыі, абазначаюць для цябе нейкую забаву, разрыўку.

Астрон

ТРЫБУНА чытачоў

ДРУЖНЫ КАЛЕКТЫЎ

Пашанай і даверам карыстаюцца члены чыгуначнага гуртка ЗСМП пры паравозным дэпо ў Чаромсе. Хачу сёння расказаць пра працу моладзі ў паравозным дэпо. Маімі субяседнікамі з'яўляюцца намеснік старшыні гуртка Янка Бадавец і сакратар Ірэна Акочук.

Гурток ЗСМП у паравозным дэпо арганізаваўся ў 1968 годзе. Гісторыя пачынаецца ад сябры Дудалевіча, які быў першым старшынёй. Потым быў Селях, Баруцінскі, а зараз Яўген Шыманюк. „Гэта амбітны і працавіты калега, — гаворыць Ірэнка, — адзін толькі недахоп, што ён працуе ў паравозных дружынах і мала мае часу пабываць дома і заняцца працай у гуртку. Таму даводзіцца рашаць праблемы хутка, але робіць ён гэта добра“.

У пачатку было іх 20 асоб, зараз 65. Гэта ўжо калектыў, з якім трэба лічыцца. І кіраўніцтва прадпрыемства супольна з партыйнай арганізацыяй, радай прафсаюзаў, усебакова разглядаюць праблемы моладзі. Намагаюцца паказваць напрамак дзейнасці, як і рашаць некаторыя праблемы ў карысць моладзі.

Да больш цікавых форм працы гуртка можна залічыць фармаванне адносін у рабочых калектывах, удзел у грамадскіх пачынах, арганізаванне сустрэч з цікавымі людзьмі, патранат над спартыўнай пляцоўкай і магіламі савецкіх салдат у ваколіцах Чаромхі (кожны год на магілках складаюць яны вянкі і кветкі у Дзень перамогі), арганізаванне брыгад сацыялістычнай працы і ўдзел у [illegible]борніцтве. У вольны час стараюцца арганізаваць экскурсіі, уласным (чыгуначным) аўтакарам.

Найбольш актыўнымі членамі з'яўляюцца: Лявон Купрыцюк, Багдан Якубец, Юрка Раманчук і Янка Габрышук.

Ул. Сідарук

КУРС

У Дубічах Царкоўных праходзіць аўтамабільны курс. Права весці машыну здабывае тут 19 асоб з вёскі Дубічы Царкоўныя і з суседніх. Заняткі вядуцца пасля абеду ў будынку мясцовага ГОКу. Курс арганізавала праўленне гайнаўскага ЛОКу і адтуль выкладчыкі. На курс ходзяць тыя, хто ўжо купіў сабе машыну, або неўзабаве купіць. Вельмі ж цяпер пайшла мода на самаходы.

М. Панфілюк

(Працяг са стар. 5)

ВЫЛЕЧЫЛІ

два велізарныя вокны, ад дзённага святла хоць іголкі збірай, але чатыры лямпачкі гараць.

Ляжаў я там дзевяць дзён і ўсе гэтыя дні ў час лекарскіх абходаў прасіў нейкага сродка для паласкання горла. Баліць яно мне. Кожны дзень абяцалі і ні разу ніхто не глянуў у горла, ды не даў нічога для лячэння. Відаць, ратавалі дэфіцыт.

У бальніцу ішоў я бадзёры, а адтуль ледзь ногі прывалок. Але ў інфармацыйнай карце напісалі, што „хворы вяртаецца дамоў у добрым стане і ні на што не скардзіцца.“

Даражэнькія, прыкідвайцеся здаровымі і не трапляйце ў бальніцу!

Васіль Петручук

Бязвер'е і надзея,
Роздумы і бестурботнасць,
Смутак і радасць,
Трывога і смеласць,
Іронія і шчырасць,
Абурэнне і захапленне,
Недарэчнасць і сэнс
Зло і дабро, —
Ці гэта ўсё сэнс жыцця?

*

О, Прасвятая Багародзіца,
Спавядаюся перад Табою
Я — маладзенькая гнілая травінка,
Грэшніца гэтага свету,
Я саграшы[illegible] словамі [illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
Рыдаючы, прашу прабачэння!

Ірэна Свентахоўская

СТАЯНКА АЎТАМАБІЛЯЎ У БЕЛАВЕЖЫ

Завяршаюцца паволі працы пры пабудове стаянкі аўтамабіляў у Белавежы. Засталося яшчэ збудаваць тут аўтаўмывальню, паставіць так званую малую архітэктуру, пасеяць траву, і пасадзіць кветкі. Ды ўжо і цяпер кожны дзень стаянка запаўняецца турысцкімі аўтобусамі з цэлай Польшчы, а то і з заграніцы. Адсюль блізка ў Палацовы парк і ў турысцкае бюро ПТТК, якое цяпер перавялі на вуліцу Вольгі Габец пад нумар 3. Побач кіёск і ларкі з памяткамі, рэстаран „Зуброўка“, бар „Вэймутка“, прыпынак ПКП, спажывецкія і прамысловыя крамы. Выходзіць, што стаянка апынулася амаль у самым турысцкім цэнтры Белавежы.

Тэкст і фота **П. Байко**

СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЯ Ў ШУДЗЯЛАВЕ

Пачатак у арганізацыі спецыялістычных гаспадарак у Шудзялаўскай гміне быў вельмі цяжкі. Тут зямля слабая, ды найгоршая справа, што балоты знаходзяцца далёка ад месца пражывання — у 20-30 кіламетрах. Але гміна прыступіла да працы, і ў 1976 годзе была арганізавана адна спецыялістычная гаспадарка па гадоўлі быдла. У 1977 годзе ўжо 12 гаспадароў прыступіла да спецыялістычнай прадукцыі жывёлагадоўлі. У наступным годзе зноў 12 гаспадароў пачало спецыялізавацца ў жывёлагадоўлі і 8 — у прадукцыі збожжа. У 1979 годзе 8 новых гаспадароў узяліся за жывёлагадоўлю і 5 — за вырошчванне збожжа. Разам цяпер 46 спецыялістычных гаспадарак працуе ў Шудзялаўскай гміне. 6 новых гаспадарак пераходзіць на гэтую сістэму прадукцыі. У Шудзялаўскай гміне выступае адна бяда: ёсць мала зялёных угоддзяў на тэрыторыі гміны, ды і тыя, якія ёсць (у нас іх завуць балотамі), знаходзяцца на тэрыторыі Супрасльскай і Гарадоцкай гміны. Гэта вельмі не спрыяе жывёлагадоўлі.

Гіль

ПА ДАРОГАХ І ПРЫПЫНКАХ

Даўно мне баліць адна агульная для нас справа. А то ж. Паміж Гайнаўкай і Бельскам расселася вялікая асада Орля, а ў ёй вядомая кафлярня. Дзякуючы народнай уладзе па ўсіх нашых дарогах пайшлі аўтобусныя лініі. Таксама і ў Орлю. Ёсць тут някепская аўтобусная пачакальня пад бокам самой гміны і пошты. Але што з таго, калі ў тую пачакальню нельга ўвайсці, бо з яе зрабілі склад бруду. І гэтак ужо пару гадоў пад бокам начальніка гміны ляжыць гэты бруд. Пытанне: ці ж не можна было б зрабіць, каб нехта, мо за невялікую плату, даглядаў і чысціў пачакальню і месца вакол яе?

Іншая справа. Часам езджу ў Дубічы Царкоўныя. І як жа жаль робіцца чалавеку, што на аўтобусных прыпынках у Пасечніках, у Істоку, у Дубічах Царкоўных павыбіваны шкляныя сцены. Гляджу так і думаю: дзе ж міліцыя? Ці дзікую бессумленную горстку буяных юнакоў нельга прысароміць? І калі ж мы пазбудземся інстынктаў такога нішчэння агульнанароднага дабра?

Трэцяя справа. Гэта Гайнаўка. Дачакалася дабрадзейства цывілізацыі — аўтобуса[illegible] у горадзе. Стала лягчэй [illegible] лавачак, ка[illegible] змаглі на 20 мінут чакання сесці. Чаму б не паспяшыць і не паставіць тыя лавачкі на гайнаўскіх гарадскіх прыпынках? Трэба.

А. Т.

ТАКІХ БОЛЬШ!

У сяле Крывяцічы ў апошнія гады з вялікім размахам вядзецца жывёлагадоўля і вырошчванне збожжа. Як паведамляе солтыс сяла Крывяцічы, да найбольш актыўных гаспадароў належаць: Фёдар Сачко — вялікія дасягненні ў вырошчванні бульбы, ільну і збожжа; Фёдар Суліма — у вырошчванні ільну, збожжа і мае вялікую тучарню свіней; Васіль Бобік — у вырошчванні бульбы, ільну, многа кантрактуе ялавічыны; Іван Клін — у вырошчванні збожжа, бульбы, вядзе найбольшую ў сяле тучарню свіней, яна механізаваная і будынак сучаснага тыпу; Мікалай Суліма — у гадоўлі быдла і ў вырошчванні бульбы і збожжа; Рыгор Суліма — у вырошчванні ільну, бульбы і ў гадоўлі бычкоў; Мікалай Гаворка — у вырошчванні бульбы, цукровых буракоў і ў гадоўлі малочных кароў; Іван Васілюк — у вырошчванні збожжа, ільну і ў гадоўлі яловак; Юрый Дружба — у вырошчванні бульбы, ільну і ў гадоўлі свіней; Віктар Чыквін — у вырошчванні збожжа, цукровых буракоў і ў гадоўлі свіней; Фёдар Чыквін — у гадоўлі свіней і малочных кароў, у вырошчванні збожжа.

Некаторыя з гэтых гаспадароў належаць да найлепшых гаспадароў ва ўсёй гміне Орля.

Іван Кірызюк

ДЛЯ РАБОЧЫХ

Шырока развіваецца сацыяльна-бытавая дзейнасць на Гайнаўскім прадпрыемстве лясных машын — Гаймахлес. З гарачых абедаў у перапынку працы карыстаецца 70 рабочых. Рабочым, якія працуюць на паветры, возяць гарачыя супы на кошт прадпрыемства. Увесь час ёсць гарачая кава і малако. Летам дастаўляюцца халодныя напіткі.

Гайнаўскі Гаймахлес вядзе ўласнае прадшколле на 120 месц. Арганізуе летнія і зімовыя лагеры дзецям. У 1979 годзе 15 працаўнікоў пабывала ў санаторыях. Кожны год арганізуецца сустрэча з былымі рабочымі прадпрыемства, якія адышлі на пенсію. Прадпрыемства пабудавала чатыры дамы сваім людзям. Прызнае пазыкі на кватэры ад 10 да 50 тысяч. Такія пазыкі атрымалі, між іншым, Аляксей Грэсюк, Мікалай Пашко, Вера Бінькоўская, Вальдэмар Храмюк, Валянціна Янюк, Веслаў Алейніцкі.

Рабочыя, якія будуюць уласныя домікі, атрымліваюць з прадпрыемства дапамогу — [illegible]нспарт для [illegible] перавозу [illegible] дам дружбы. Вось такая [illegible]йнасць у Гаймахлесе з кожным годам узрастае.

Вірскі

ТАК БЫЦЬ НЕ ПАВІННА!

Вяртаўся я з Беластока дамоў цягніком у 15.34. Калі даехаў да Бельска, мой знаёмы кажа: глянь, што за дзіва... Я глянуў у бок перонаў. На лаўцы каля будкі дзяжурнага руху разваліўся нейкі п'яны жыватом дагары, з расшпіленай кашуляй. Іншы — у іншай позе, тварам уніз, расцягнуўся пад суседняй лаўкай. Усё гэта было на вачах чыгуначнікаў і падарожных. Нікому і ў галаву не прыйшло, каб хоць пазваніць гарадской міліцыі, каб прыбрала неяк гэтых непрытомных людзей.

І яшчэ адна справа. Законы дзяржаўнай чыгункі забараняюць піць гарэлку ў вагонах. А што ў нас творыцца? Амаль з кожнага беластоцкага цягніка вылятаюць праз вокны вагонаў бутэлькі. Асабліва многа іх вылятае пасля зарплаты. А потым ужо адбываюцца „канцэрты“. Аж вушы пухнуць ад дзікіх віскаў і крыкаў. І ніхто не дзіваваўся б, калі б там не было чыгуначнікаў. Трэба гэтыя дрэнныя звычаі, якія прыняліся на чыгуначных станцыях і ў вагонах, выкараняць. І павінны гэта зрабіць чыгуначныя ўлады.

(м-ка)

ПРА „БЯЛЬЧАНКУ“

Рэстаран „Бяльчанка“ ў Бельску людзі хваляць. Калі б не зайшоў туды, заўсёды парадак. Заўсёды атрымаеш цёплы суп і другое блюда таксама смачнае. Афіцыянткі вельмі прыемныя. Ветліва вядуць сябе з людзьмі. Я, напрыклад, вельмі часта хаджу туды на абед. Кожны раз падыходзіць да мяне афіцыянтка, прыемна пытаецца, што мне прынесці. Прыносіць яду хутка, ды яшчэ і прыемнага апетыту пажадае. Вельмі падабаюцца гасцям бельскія афіцыянткі. Бо яны заўсёды вясёлыя і ветлівыя.

Павел Панфілюк

АДКАЗ НА АДКАЗ

У „Ніве“ № 23 ад 8 VI 1980 г. быў змешчаны адказ начальніка Р. Дробіка з ЦДОКП у Варшаве на чатыры заметкі, якія датычылі балагану на чыгунцы ў межах нашага ваяводства. Адказваючы на заметку, у якой я пісаў пра змяншэнне саставу цягніка з Гайнаўкі ў Белавежу, начальнік не выказаў свайго пункту гледжання.

Адносна непасрэднага ранняга цягніка на лініі Белавежа-Беласток. Думаю, што Белавежа — галоўны ў ваяводстве цэнтр турызму і Гайнаўка — найбольшы прамысловы цэнтр пасля Беластока, павінны мець такі цягнік. Тлумачэнне, што гэтым цягніком людзі не даязджаюць да працы, таму ён тут непатрэбны, жыхары спамянутых мясцовасцей і турысты не могуць прыняць. Яно проста непрадуманае.

Пётр Байко

ЖАДАЮ СТО ГАДОЎ ЖЫЦЦЯ

бабулі, пастаяннай чытачцы „Нівы“, Дамініцы Івацік з Ахрымаў

Яе лісты ў рэдакцыю, якія часта публікуюцца ў „Нашай пошце“, гэта нешта сапраўды каштоўнае! Як цудоўна непасрэдна яна дзеліцца ў іх з чытачамі сваім жыццём і перажываннямі, сваімі ўспамінамі аб цяжкім сялянскім лёсе і працы. Ды не толькі пра сябе піша бабуля, але і пра іншыя цікавыя справы з далёкага мінулага, як, напрыклад, ліст з 24 нумара „Нівы“, дзе апісала яна трагічнае здарэнне з часоў перад І сусветнай вайной. Якая ўжо гэта гісторыя!

На дадатак бабуля Дамініка пасылае ў рэдакцыю цудоўнейшыя народныя песні, якія некалі спяваліся дзяўчатамі на разлеглых лугах нашых і якія маюць несмяротную вартасць. Як я рады, што бабуля піша ў рэдакцыю і піша так ясна і адкрыта. Часта сустракаемся з фактам, што старэйшыя людзі ў сваіх успамінах больш хваляцца, чым апісваюць сапраўднасць. У бабулі Дамінікі гэтай „хваробы“ няма. Буду ў далейшым з нецярплівасцю сачыць за яе лістамі. А [illegible] бабу[illegible] сардэ[illegible]ае пажаданне добрага здароўя і свет[illegible] памяці.

М. Панфілюк

ВОДГУК

У гэты дзень я быў вельмі заняты, нават забыў паабедаць. Толькі ўвечары забег у сталоўку паесці. Я з'еў запар дзве тал[illegible]ршчу, не адчуўшы смаку, дзве ка[illegible]ты. І тут мне падсунулі гэтую кнігу.

— Што [illegible]? — спытаў я.

— Гэта [illegible] — сказалі людзі. — Будзьце [illegible]ы, напішыце.

Я зірну[illegible]. Гэта былі работнікі сталовай.

— Што [illegible]сацъ? — не зразумеў я.

Работн[illegible]овай усміхаліся.

— Напішыце водгук, — прасілі яны. — Мы ве[illegible] просім.

Я трош[illegible]ўся і спытаў:

— Чаму [illegible]ме[illegible]іта я павінен яго напісаць? [illegible] кожнага просіце так?

— О! [illegible]кнулі яны. — Вы з такім апетытам елі наш боршч! Толькі вы можаце на[illegible]!

— Гм! [illegible]ўся я яшчэ больш. — Вы так ду[illegible]?

— Не то[illegible]ькі мы, — узрадаваліся работнікі ста[illegible]. — Усе так думаюць. Усе глядзелі [illegible] вас, як вы елі боршч.

— Чаму? — [illegible]здзівіўся я яшчэ больш.

— Таму, што вы елі з вялікім апетытам і ахво[illegible]. У нас рэдка хто так есць. За [illegible]я пяць гадоў ніхто не еў з такім [illegible]там.

— Гм! — [illegible]віўся я яшчэ больш. — Дзіўна.

Але яны [illegible]далі мне думаць, разгарнуўшы кні[illegible]азалі:

— Фа[illegible] зафіксаваны. Елі вы з апетытам. [illegible] сталовая гэта бачыла. Так што [illegible]апішыце падзяку і распішыцеся.

Работнік[illegible]упілі мяне з усіх бакоў і ўжо не пра[illegible]лі, а патрабавалі. За іх спінамі бы[illegible]ледачы-кліенты. Твары кліентаў г[illegible]лі пра тое, што яны могуць заўтра пацвердзіць, што я еў з апетытам.

Я выму[illegible] быў напісаць: „Я з апетытам еў [illegible] і катлеты".

Кнігу л[illegible]а[illegible]ьна вырвалі ў мяне з рук і пане[illegible]лі, [illegible]к вялікую каштоўнасць.

Кухар [illegible]аў зірнуць на мяне. Ён прыжмуры[illegible] і сказаў:

— Яшчэ ўздумаў ламацца, пісаць не хацеў, сабачы сын!

Мікола Корч

Без сло[illegible]

НІЎКА

— *О, колькі вас! Проста не ведаю, каму ж аддаць перавагу?*

ЦІШЫНЯ І СПАКОЙ

— Татку, а што мелі людзі, калі не былі вынайдзены тэлевізар?

— Цішыню і спакой, мой хлопчык.

ШТО ГЭТА ТАКОЕ?

Скардзіцца суседка суседцы:

— Маю курэй, як пылу, а яйка не бачу. І што гэта такое...

— А ў мяне наадварот, — кажа другая, — ніводнай куркі, а яец у хляве, як бараболі.

ХІБА Ж ГЭТА ЁСЦЬ?

Адзін малады чалавек сустракае на ўзлессі бабулю ды й пытае:

— Ну, як, грыбкі ёсць?

— Ёсць, — адказвае тая.

— А дзе ж яны? — цікавіцца малады чалавек.

— Шукайце!

— Э, ды хіба ж гэта ёсць, калі іх шукаць яшчэ трэба!

Палавіна рэкорду.

МІНІВЕРШЫ

МОДНАЯ БЛУЗКА

— Дзе квяцістая, дзед, блузка? —
Запытала бабка Лушка.
Адказаў ёй дзед Якуб:
— Апрануў унук у клуб.

СУЧАСНЫ ХАБАРНІК

— Твой хабар, дружа, не вазьму,
І сам ты ведаеш чаму.
— Не хабар тут, а падарунак.
— Тады хутчэй давай пакунак.

Б. Мароз

ГУМАР З БАРАДОЮ

— Вось, цётка, будзеш даваць гэтае лякарства свайму старому па дзесяць лыжак у дзень.

— А Божа ж мой! Дзе ж я вазьму столькі лыжак. У мяне толькі чатыры ёсць.

НА ШЫРОКІМ СВЕЦЕ

— Выбачайце, аднак вашы вершы хутчэй належаць да прозы, — вяртае рэдактар рукапіс пачатkоўцу.

— Згодны, — адказвае малады. — У такім разе прашу выдаць маю кнігу апавяданняў.

*

Кале знайшоў каня і, не ведаючы што з ім рабіць, звярнуўся да паліцэйскага.

— Адвядзі яго ў заапарк, — сказаў той.

На наступны дзень паліцэйскі бачыць Кале з тым жа канём.

— Ты быў з ім у заапарку? — спытаў паліцэйскі.

— Вядома, быў, а цяпер мы ідзём у кіно...

*

На пахаванні доктара Ларсана не прысутнічаў ніводзін з яго былых пацыентаў.

— Відаць, гэтага доктара не вельмі любілі, — заўважыў нехта з прахожых.

— Ды не, любіць вось яго любілі, проста ўсе яго пацыенты ўжо чакаюць яго...

ЗАЎЗЯТЫ РЫБАК

Кастусь збіраецца на рэчку. Жонка да яго і кажа:

— Дзіўна, што ты сёння вырашыў парыбачыць. Дык жа панядзелак — нешчаслівы дзень.

— Ды і добра! Можа рыбе таксама не пашанцуе...

СВОЙ НЕ ЎЦЯЧЭ

Ідзе задрыпанец дадому, а насустрач яму ледзь ногі цягне п'яны сусед.

— Ты куды гэта сярод ночы? — пытае здзіўлена.

— Туды...

— Давай я цябе лепш дадому адвяду.

Прыходзяць дахаты, пастукалі ў акно і чакаюць. Аж тут жонка з'явілася на парозе і як трэсне калкам цвярозага.

— Завошта ж? — завыў сусед.

— Нічога! — крычыць разгневаная жанчына. — Свой нікуды не ўцячэ.

ПА АДЗЕННІ СУСТРАКАЮЦЬ...

На вечар адпачынку ў школе запрасілі і бацькоў. Усе весела танцавалі ў актавай зале, а я ўладкаваўся ва ўтульным куточку і размаўляў з маім суседам.

— Проста цудоўны вечар, — прамовіў я. — Толькі вось некаторыя дзяўчынкі неяк смешна апрануты. Вунь гляньце, напрыклад, на тое стварэнне: валасы кароткія, штаны нацягнула... Не ведаеш, дзе тут дзяўчына, а дзе хлопец.

— А гэта мая дачка...

— Ой, даруйце, калі ласка, мае недарэчнасць, я ж не ведаў, што вы яе бацька.

— Ніякі я не бацька. Я яе маці.

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Wschód słońca w stadninie koni

Z repertuaru Seweryna Krajewskiego

Słowa: **Krzysztof Dzikowski**
Muzyka: **Seweryn Krajewski**

Słońce nad stadniną w końską grzywę chowa twarz,
wstęgą nad łąkami jeszcze się unosi mgła,
stoją napięte jak strzała, gdy drży,
nim cięciwy świst znów do lotu ją poderwie.
Konie, dumne konie w blasku wstającego dnia,
lekkie i swobodne, jak na czystym niebie ptak,
kiedy tak patrzę, do biegu się rwą,
chciałbym uciec stąd, chciałbym gnać za swą tęsknotą.

Tam, gdzie lśni horyzont,
drga niebieska linią,
wprost w otwarte wrota chmur, siwych chmur,
tam, gdzie w „kuźni słońca"
dzień powstaje nowy,
gdzie wytacza drogi rytm, serca rytm.

Konie, dumne konie w blasku wstającego dnia,
czułe i szalone, czemu was uwielbiam tak?
Nieraz poniosą, poniosą jak wiatr,
czasem bywa tak, jak z dziewczyną, jak z dziewczyną...

Tam, gdzie lśni horyzont...

Ён валодаў дзіўным дарам — гаварыў толькі тое, што думаў начальнік.

— *Што каму.*

ІВАН, СЦЯПАН І РЭСТАРАН

Іван нясе цяжкую скрынку на плячах. Насустрач — Сцяпан.

— Здароў, дружбак!

— Прывітанне, браток.

— Што нясеш?

— Цвікі.

— Што ты кажаш?! Дзе здабыў?

— У тваім рэстаране.

— Не жартуй... Шкада вось: няма такой базы, якая забяспечвала б такія ўстановы, як, скажам, твой інстытут або мой рэстаран. І цвікі патрэбны, і фарба. Сталяр ёсць, а рабіць няма чым. Дык скажы, будзь ласкаў, дзе знайшоў цвікі?

— Кажу табе: у рэстаране. Пасядзеў пару гадзін з адным супрацоўнікам з будтрэста і вось яны цвічочкі-галубочкі.

— Слухай, браток! Пасядзі ты і са мной хоць паўгадзінкі. Адпачнеш — лягчэй цвікі несці будзе.

Аляксандр Паноў

Кур'ёзы

АХВЯРА ПРЫГАЖОСЦІ

На свеце мн[illegible] прыгожых птушак. Сярод [illegible]не апошняе месца займае [illegible]матлікі атрад папугая[illegible]. [illegible]учае гэтых стракатых не [illegible]ькі дзівоснае спалучэнне прыродных колераў [illegible]энні, а яшчэ і тое, ш[illegible] параўнальна лёгка і даверліва ўваходзяць у [illegible] з чалавекам, да[illegible] [illegible]спяхова вучацца вымаўляць словы.

Гаварыць [illegible]апугай [illegible] гаворыць, ды не [illegible] што гэта яго здольнасць [illegible] заўсёды яму на [illegible]. У апошнія гад[illegible]сюдзілася хваравітая [illegible]да трымаць птушак [illegible]кватэры. Асабліва ў ЗША. [illegible] званы сярэдні ам[illegible] лічыць за прэсці[illegible] мець дамашняга папугая. Ды такога, каб пад[illegible] іншых знаёмых не было.

Ну, а паколькі многія багатыя амерыка[illegible] плацяць за аднаго папугая [illegible] 10 тысяч долараў, [illegible] гэтым добра грэюць [illegible]рытнюгі-дзялкі, якія [illegible]зілі шырокі гандал[illegible] прыгожай птушкай. Існую[illegible]цыяльныя кампаніі [illegible]астаўцы папугаяў з Філ[illegible] Аўстраліі, Афрыкі, [illegible] Паўднёвай Амерыкі. [illegible] змагаюцца супраць гэтай з'явы прадстаўнікі [illegible]народнага таварыства па [illegible] жывёльнага свету, гандаль набывае ўсё больш[illegible]окі размах нелегальна. [illegible]-браканьеры лов[illegible] птушак сілкамі, перавоз[illegible] у чамаданах і інш[illegible] з патаемнымі [illegible]двойнымі сценкамі і дном[illegible] выніку чаго многія [illegible]уць.

Большасць п[illegible] папугаяў амаль не [illegible]жаецца ў няволі. Такім [illegible], іх колькасць р[illegible]яншаецца, і скора яны [illegible]гуць зусім звесціся. [illegible] бедны папугай зра[illegible] ахвярай свайго лінгвістычнага „таленту", прыгож[illegible] і здольнасці прыгожыць быт знатных [illegible]аможных гультаёў.

Добра, калі [illegible] галава на плячах і апра[illegible] таго свая рука там, дзе [illegible]